ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ПЯТНІЦА, 6 МАЯ 1938 г. № 25 (367)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ДЗЕНЬ БОЛЬШЭВІЦКАГА ДРУКУ

Слаўныя традыцыі дня большэвіцкага друку звязаны з узнікненнем ленінска-сталінскай «Праўды», першы нумар якой выйшаў 5 мая 1912 года. Гэта быў год новага магутнага ўздыму рабочага руху ў Расіі, год гістарычных ленскіх падзей. На хвалі гэтага рэвалюцыйнага ўздыму нарадзілася большэвіцкая «Праўда», першая штодзённая рабочая газета ў Расіі. Непасрэднымі арганізатарамі «Праўды» былі стваральнікі нашай вялікай комуністычнай партыі таварышы Ленін і Сталін.

Заснаваная на рабочыя ўзносы, на рабочыя пятакі «Праўда» з першых дзён свайго існавання стала масавай рабочай газетай, стала ў цэнтры барацьбы за магутную, маналітную масавую партыю большэвікоў, за падрыхтоўку рабочага класа да новай рэвалюцыі, да штурму капіталізма.

Праз два годы, рыхтуючыся да юбілея «Праўды», група праўдзістаў унесла прапанову адзначыць юбілей правядзеннем дня рабочага друку. Гэта прапанова знайшла шырокі водгук у чытачоў. 5 мая 1914 года «Праўда» выйшла ў святочным афармленні з надпісам: «Нумар газеты прысвечан стварэнню штодзённага марксісцкага друку ў Расіі». З гэтага часу юбілей «Праўды» стаў традыцыйным днём усяго большэвіцкага друку.

За ўвесь свой 26-гадовы шлях большэвіцкая «Праўда», у якой непасрэдны ўдзел прымалі таварышы Ленін, Сталін, Молатаў, Калінін, адыграла велізарнейшую ролю ў арганізацыі, росце і ўмацаванні нашай партыі.

«Праўда» — баявы орган ленінска-сталінскага ЦК нашай партыі — заўсёды высока трымала і трымае сцяг большэвіцкай прынцыповасці, ідэйнасці, змагаючыся з агентурай буржуазіі ў рабочых радах, са здраднікамі рэвалюцыйнага руху і соцыялістычнай краіны, наёмнымі агентамі фашызма.

З імем «Праўды» звязаны нашы перамогі над буржуазіяй, з імем «Праўды» звязаны поспехі нашага соцыялістычнага будаўніцтва, урачыстасць соцыялізма.

Бязмежна велізарна роля «Праўды» ў арганізацыі, умацаванні і росце ўсяго нашага большэвіцкага друку. «Праўда» дапамагала і дапамагае нашым газетам, «Праўда» выхоўвала і выхоўвае адданых справе партыі Леніна—Сталіна, справе соцыялізма сотні і тысячы работнікаў большэвіцкага друку. Таму дзень «Праўды», яе юбілей з'яўляецца аглядам работы ўсяго большэвіцкага друку.

У царскай Расіі ў 1913 годзе выдавалася 859 газет з тыражом у 2 мільёны 729 тысяч экземпляраў. У 1937 годзе ў СССР выходзіла 8.521 газета з тыражом у 36 мільёнаў 197 тысяч экземпляраў. Рост — амаль у 14 разоў.

Але справа не толькі ў колькасным росце. Пераважная большасць дарэвалюцыйных газет прапаведвала класавы мір у інтарэсах царызма, памешчыкаў і капіталістаў, як цяпер у капіталістычных краінах выходзяць газеты, якія атручваюць свядомасць чытачоў.

«Капіталісты называюць свабодай друку, — гаварыў Уладзімір Ільіч Ленін, — свабоду падкупу друку багатымі, свабоду скарыстоўваць багацце для фабрыкацыі і падзелкі так званай грамадскай думкі». У краінах фашызма друкаванае слова скарачаецца, газеты уніфіцыруюцца, робяцца на адзін фашысцкі капыл.

Толькі ў адной краіне—краіне соцыялізма свабода друку атрымала выдатнейшае выражэнне. Сталінская Канстытуцыя законам гарантуе грамадзянам СССР, у адпаведнасці з іх інтарэсамі, у мэтах умацавання соцыялістычнага ладу, свабоду друку.

Больш таго, правы грамадзян СССР на свабоду друку забяспечваюцца прадастаўленнем працоўным і іх арганізацыям друкарняў, паперы, сродкаў сувязі. Толькі гэтым можна вытлумачыць рост друку ў нашай краіне ў нябачаных дагэтуль памерах. Споўнілася мара рускага паэта Некрасава аб тым часе, калі мужык «Белинского и Гоголя с базара понесет». Класікі сусветнай і рускай літаратуры, літаратуры народаў СССР выдаюцца ў нашай краіне ў мільённых тыражах. У 1937 годзе ў СССР выпушчана на рынак кніг у 8 разоў больш, чым у 1913 годзе ў царскай Расіі.

Фашызм разбурае сусветную культуру, скарбніцы мастацтва, спальвае кнігі геніяльных мысліцеляў. У краіне соцыялізма культура квітнее з кожным годам. Кнігі Генрыха Гейне, спаленыя на яго радзіме, выйшлі ў СССР за 20 год у 735 тысячах экземпляраў,— колькасці, у шэсць разоў большай у параўнанні з дарэвалюцыйным дваццацігоддзем.

У 12 разоў павялічыўся выпуск кніг Бальзака, у 35 разоў павялічылася выданне твораў А. М. Горкага, у 80 разоў павялічыўся выпуск кніг вялікага рускага сатырыка Салтыкова-Шчэдрына.

Рост друку СССР паказвае рост палітычнай актыўнасці мас, рост іх культурнага і маральнага узроўню.

Правільнае вырашэнне ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі стварала ўмовы для велізарнейшага росту нацыянальных літаратур.

У нашай краіне літаратура выдаецца на 111 мовах народаў СССР. На тэрыторыі Таджыкскай, Кіргізскай, Туркменскай і Беларускай саюзных рэспублік да рэвалюцыі не выдаваліся кнігі на роднай мове. Соцыялістычная рэвалюцыя, паспяховае будаўніцтва соцыялізма прынесла ўсім народам СССР велізарнейшыя дасягненні ў справе росквіту іх культуры і друку. Выданне літаратуры ў Беларусі павялічылася з 212 тысяч экземпляраў у 1913 годзе да 8 мільёнаў 833 тысяч у 1937 годзе, прычым 6 мільёнаў 967 тысяч—на беларускай мове.

Дзень друку ў гэтым годзе супадае з падрыхтоўкай да выбараў у Вярхоўныя Советы саюзных рэспублік. Совецкая Беларусь, роўнапраўная сястра сярод адзінаццаці братніх рэспублік, пачала ўжо выбарчую кампанію.

Першым кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР беларускі народ назваў Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна, найвялікшага генія чалавецтва, правадыра народаў, друга і настаўніка беларускага народа. Кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР вылучаны лепшыя саратнікі вялікага Сталіна таварышы Молатаў, Варашылаў, Кагановіч, Калінін, Ежоў.

Перад газетамі на бліжэйшыя два месяцы пастаўлена важнейшая задача арганізацыі мас на аднадушнае выбранне дэпутатамі Вярхоўнага Совета кандыдатаў блоку комуністаў і беспартыйных. Друку належыць велізарнейшая роля ў справе агітацыі за кандыдатаў, у справе масавай падрыхтоўчай работы да выбараў.

Выдатныя пісьменнікі заўсёды трымалі самую шчыльную сувязь з газетамі. Асабліва павялічваецца неабходнасць такога шчыльнага кантакту з друкам і ўдзелу пісьменнікаў у газетах зараз, у перыяд падрыхтоўкі да выбараў Вярхоўнага Совета. Актуальныя песні, вершы, нарысы, апавяданні з'яўляюцца важнейшым фактарам актыўнага ўдзелу пісьменнікаў у выбарчай кампаніі. Сёння нельга яшчэ сказаць, што задача гэта выканана. І наша газета, і ўвесь друк Совецкай Беларусі чакае ад пісьменнікаў актыўнейшага ўдзелу ў перадвыбарчай рабоце, актыўнейшай падрыхтоўкі работнікаў мастацкага слова да выбараў у Вярхоўны Совет рэспублікі.

Магутны калектыўны арганізатар, прапагандыст і агітатар — большэвіцкі друк адзначае свой дзень паляпшэннем сваёй работы, ачышчэннем сваіх радоў ад ворагаў народа, умацаваннем сувязей з масамі, з народам, папаўненнем сваіх радоў новымі кадрамі, згуртаванасцю вакол партыі Леніна—Сталіна. Слаўныя традыцыі большэвіцкай «Праўды» сталі асновай работы усяго друку ў СССР. Наш большэвіцкі друк быў і застаецца самай вострай зброяй і самым дзейсным памочнікам партыі Леніна—Сталіна ў барацьбе за комунізм.

Таварышы І. В. СТАЛІН, В. М. МОЛАТАЎ і М. І. КАЛІНІН на трыбуне маўзалея Леніна ў часе першамайскага парада ў Маскве. Фото Ф. Кіслова (СФ).

ПРАМОВА НАРОДНАГА КАМІСАРА АБАРОНЫ СССР МАРШАЛА СОВЕЦКАГА САЮЗА тав. ВАРАШЫЛАВА К. Е. на парадзе 1 мая 1938 года

Таварышы чырвонаармейцы, камандзіры, камісары і палітработнікі! Таварышы рабочыя і работніцы, калгаснікі і калгасніцы! Таварышы стаханаўцы ўсіх галін народнай гаспадаркі! Таварышы інжынеры і тэхнікі, вучоныя і работнікі мастацтваў! Таварышы прадстаўнікі працоўных зарубежных краін — нашы дарагія госці!

Ад імя і па даручэнню Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў) і рабоча-сялянскага ўрада Совецкага Саюза вітаю ўсіх вас з міжнародным святам рабочага класа — Першае Мая.

Таварышы! Сёння ўвесь наш вялікі народ — народ тварэц новага соцыялістычнага жыцця, святкуючы дзень міжнароднай салідарнасці працоўных, зноў і зноў падводзе вынікі сваім перамогам на ўсіх участках будаўніцтва соцыялізма.

І на гэты раз, як заўсёды, гэтыя вынікі бліскучыя. Карабль соцыялізма, рассякаючы хвалі труднасцей, адкідваючы з шляху свайго ўсё смецце, няўхільна і быстра ідзе наперад.

Таварышы! Совецкі дзяржаўны карабль, аснашчан добра. Яго каманда—гэта наша слаўная комуністычная партыя, партыя **Леніна—Сталіна.** На чале гэтай выдатнай, цудоўнай, справамі сведчачай аб сваёй магутнасці, каманды стаіць вялікі кормчы — наш непараўнаны, вялікі **Сталін.**

Таварышы! Такому караблю не страшны ні пучыны знешніх авантур, на якія за апошні час не мала ахвотнікаў, ні падводныя камені ўнутранай здрадніцкай мразі, якую наш урад, партыя, увесь народ бязлітасна знішчаюць.

Магутнасць нашай дзяржавы нязменна расце. Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот зорка і грозна стаяць на рубяжах совецкай зямлі, гатовыя кожны момант да дзеяння супроць агрэсіўнага ворага.

Вялікі совецкі народ, урад, большэвіцкая партыя, армія і флот па-ранейшаму з той-жа сілай стаяць за мір ва ўсім свеце. Сёння ўвесь наш народ выразіць сваё негадаванне ўсім агрэсарам і гвалтаўнікам, усім падпальшчыкам і робячым войны.

Сёння, як заўсёды, але сёння яшчэ больш горача, мы шлем наша совецкае брацкае прывітанне доблесным героям —барацьбітам за сваю незалежнасць, за права на жыццё і ўсяму народу гераічнай Іспаніі і вялікага доблеснага Кітая.

Таварышы! Сёння дзень прысягі маладых байцоў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Паўтарайце за мной словы прысягі, прысягі на вернасць свайму Рабоча-Сялянскаму Ураду, на вернасць вялікай совецкай Радзіме.

(Тав. **Варашылаў** чытае тэкст прысягі, паўтараемы ўсімі маладымі чырвонаармейцамі).

Таварышы маладыя чырвонаармейцы! Віншую вас з уступленнем поўнапраўнымі байцамі ў нашу армію, армію пераможнага соцыялізма.

Не сумняваюся, што вы прыўмножыце магутнасць і сілу нашай доблеснай арміі, што вы будзеце гэтак-жа, як і вашы старшыя браты і бацькі, зорка сачыць за рубяжамі нашай вялікай радзімы і, калі вораг уздумае пасягнуць на іх, станеце грудзьмі і пранзіце ворага зброяй нашай вялікай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Няхай жыве міжнароднае свята пролетарскай салідарнасці!

Няхай жывуць працоўныя і прыгнечаныя ўсяго свету!

Няхай жыве магутны совецкі народ!

Няхай жывуць доблесная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і слаўны Ваенна-Марскі Флот!

Няхай жыве мудрая і слаўная партыя **Леніна—Сталіна!**

Няхай жыве наш мудры, вялікі **Сталін!** Ура!!!

НА БЕРАЗЕ ЦІХАГА АКІЯНА

Парад у Владзівастоку прымаў нарком Ваенна-Марскога Флота тав. П. А. СМІРНОЎ

ВЛАДЗІВАСТОК. 1 мая. (БЕЛТА). Скрозь лёгкую дымку праглядвае веснавое сонца. Марскі вецер грае сцягамі на будынках горада, на ўпрыгожаных суднах у парту. З раніцы вуліцы поўны ўжо народам. Свята пачынаецца ў поўдзень.

Прыбыўшы ў Владзівасток народны камісар Ваенна-Марскога Флота, армейскі камісар 1-га ранга тав. П. А. Смірноў прымае парад. Пасля аб'езду выстраіўшыхся воінскіх часцей ён вітае працоўных з міжнародным святам 1 мая.

— Наша родная Чырвоная Армія, Чырвоны Флот і іх перадавыя атрады — Асобая Чырвонасцяжная Далёкаўсходняя армія і Ціхаакіянскі флот, — гаворыць нарком, — з'яўляюцца магутнай сілай, гатовай у любую мінуту даць сакрушальны ўдар зарваўшымся правакатарам, падпальшчыкам вайны, усім тым, хто паспрабуе пасягнуць на шчасце вялікага совецкага народа.

Пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў і рабоча-сялянскага ўрада, дзякуючы штодзённым клопатам нашага вялікага Сталіна, мы ўжо будуем і ў бліжэйшы час створым магутны марскі і акіянскі флот, дастойны нашай вялікай радзімы.

Граніцы Совецкага Далёкага Усхода заўсёды былі на замку, сёння яны яшчэ больш непрыступны як з сушы, так і з мора. У гэтым ужо не раз упэўняліся японскія захватчыкі. Няхай гэта будзе для іх і надалей грознай перасцярогай.

Шчаслівы радасны народ краіны пераможнага соцыялізма вялікі і грозны ў сваім гневе супроць ворагаў.

Тав. Смірноў выказвае ўпэўненасць, што працоўныя Владзівастока з гонарам выканаюць задачы ўмацавання абароны Совецкага Прымор'я. Нарком заклікае байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Ціхаакіянскага флота да яшчэ большай пільнасці па ахове граніц на Ціхім акіяне ад усякіх правакацый і спроб уварвацца на нашу зямлю і ў нашы воды.

— Удасканальвайце сваю баявую падрыхтоўку, — гаворыць нарком, — умацоўвайце воінскую дысцыпліну, дакладна выконвайце праграму будаўніцтва магутнага Ваенна-Марскога Ціхаакіянскага флота.

Тав. Смірноў чытае тэкст прысягі, і чырвонафлотцы чотка паўтараюць за ім словы ўрачыстага абяцання быць вернымі і адданымі да канца свайму народу, сваёй краіне.

Нарком вітае байцоў з прыняццем прысягі. Радаснае, доўганезмаўкаючае «ура». Гарматны салют абвяшчае аб пачатку парада. Яго адкрывае зводная часць комсастава.

Рослыя, бліскучыя здароўем і сілай, маракі Ціхаакіянскага Флота чоткімі радамі ідуць каля трыбуны.

Пачынаецца дэманстрацыя працоўных. Калі дзесяткі тысяч дэманстрантаў прайшлі перад трыбунай у святочных калонах, радыё прынесла з Масквы вестку аб пачатку парада на Краснай плошчы.

ПРЫЁМ УДЗЕЛЬНІКАЎ ПЕРШАМАЙСКАГА ПАРАДА КІРАЎНІКАМІ ПАРТЫІ І УРАДА У КРЭМЛІ

У Вялікім Крэмлёўскім палацы 2 мая адбыўся прыём удзельнікаў першамайскага парада кіраўнікамі Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў) і ўрада СССР.

Да 18 гадзін у велізарных залах Крэмлёўскага палаца сабраліся ўдзельнікі першамайскага парада: камандзіры, палітработнікі, інжынеры і тэхнікі ўсіх званняў і ўсіх родаў войск Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, дэманстраваўшыя напярэдадні несакрушальную магутнасць узброеных сіл вялікага совецкага народа.

У 18 гадзін 30 мінут у Георгіеўскай зале з'яўляюцца таварышы Сталін, Молатаў, Варашылаў, Кагановіч, Калінін, Андрэеў, Чубар, Мікаян, Ежоў. Бурныя, доўга незмаўкаючыя авацыі нясуцца насустрач кіраўнікам партыі і ўрада. Грамавым чырвонаармейскім «ура» прысутныя вітаюць вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна і яго бліжэйшых саратнікаў.

Ад імя ЦК ВКП(б) і ўрада Саюза слаўных байцоў, камандзіраў і палітработнікаў — удзельнікаў першамайскага парада —вітае народны камісар абароны маршал Совецкага Саюза тав. Варашылаў. Першае сваё слова тав. Варашылаў прысвячае Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскому Флоту.

Зварачаючыся да сабраўшыхся, ён гаворыць:

— Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія дэманстравала ўчора — не толькі на Краснай плошчы нашай саюзнай сталіцы, але і на плошчах другіх гарадоў совецкіх рэспублік і абласцей — сваю магутнасць, сваю арганізаванасць, сваю высокую боездольнасць. Як і раней, яна паказала сябе ўчора ў поўнай баявой гатоўнасці, паказала, што яна можа ў любую мінуту кваліфікавана біць ворага.

Гэтыя словы таварыша Варашылава пакрываюцца бурнымі апладысментамі ўсіх прысутных на вечары.

Следам за гэтым таварыш Варашылаў гаворыць аб нашым вялікім, цудоўным і пакуль што адзіным ва ўсім свеце совецкім народзе, які так горача любіць сваю Чырвоную Армію і Ваенна-Марскі Флот і робіць усё для іх магутнасці і непераможнасці.

Словы таварыша Варашылава, прысвечаныя слаўнай Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў) і арганізатару і натхніцелю нашых перамог, самаму блізкаму і зразумеламу ўсім працоўным, вялікаму Сталіну, сустракаюцца гарачымі авацыямі ўсёй залы. Доўга незмаўкаўшымі апладысментамі, крыкамі: «Ура таварышу Сталіну», «Няхай жыве наш любімы Сталін», «Прывітанне вялікаму правадыру працоўных таварышу Сталіну» прысутныя на прыёме ў Крэмлі выражаюць мыслі і пачуцці ўсёй Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Пад бурныя, поўныя захаплення апладысменты ўсіх прысутных таварыш Варашылаў перадае прывітанне ад Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі главе совецкага ўрада старшыні Совета Народных Камісараў СССР Вячаславу Міхайлавічу Молатаву і старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета Міхаілу Іванавічу Калініну.

Следам за гэтым з прамоваю выступіў таварыш Молатаў, які горача вітаў байцоў, камандзіраў, начальнікаў усіх відаў зброі і ўсіх родаў войск і камандзіра камандзіраў — Клімента Ефрамавіча Варашылава. Доўга не змаўкае бурная авацыя ўсёй залы ў гонар правадыра Чырвонай Арміі маршала Совецкага Саюза таварыша Варашылава.

Для ўдзельнікаў прыёма быў дан канцэрт, у якім выступалі народныя артысты СССР Барсава і Рэйзен, заслужаныя артысты рэспублікі Казлоўскі, Міхайлаў, Нарцоў, Образцоў, салісты балета Вялікага тэатра Лепяшынская і заслужаны артыст РСФСР Ермалаеў, лаўрэаты ўсесаюзнага і міжнародных конкурсаў піяніст Фліер і скрыпачка Гілельс, чырвонаармейскі балалаечны аркестр ЦДЧА імя Фрунзе і джаз-аркестр пад кіраўніцтвам Уцёсава.

Першамайскі парад у Менску. НА ЗДЫМКАХ: конніца, пяхота і фізкультурнікі на парадзе. Белсаюзфото.

ПЕРШАМАЙСКІ ПАРАД У МАСКВЕ

Задоўга да пачатку парада гранітныя трыбуны ўздоўж крэмлёўскай сцяны перапоўнены. Тут — стаханаўцы і ўдарнікі прадпрыемстваў сталіцы, дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР, Героі Совецкага Саюза, пісьменнікі, дзеячы мастацтва, навукі і тэхнікі. Воплескамі і прывітаннямі сустракаюць масквічы замежныя дэлегацыі. Асабліва гарачыя прывітанні звернуты да сыноў і дачок геравічнага іспанскага народа.

Асобныя трыбуны займаюць члены дыпламатычнага корпуса.

9 гадзін 30 мінут. Камандуючы парадам маршал Совецкага Саюза С. М. Будзённы аб'язджае войскі і вітаецца з імі.

Урачыстая цішыня запанавала на плошчы. Роўна ў 10 гадзін на трыбуну маўзалея паднімаюцца таварышы **Сталін, Молатаў, Кагановіч, Калінін, Андрэеў, Чубар, Мікаян, Ежоў, Дзімітраў, Шкіратаў, Швернік, Угараў, Булганін.** Доўга над плошчай не змаўкае лікуючае «ўра» ў гонар вялікага правадыра і друга ўсіх працоўных таварыша Сталіна, у гонар яго саратнікаў.

З Спаскіх варот Крэмля выязджае народны камісар абароны маршал Совецкага Саюза тав. К. Е. Варашылаў.

Прыняўшы рапарт камандуючага парадам, тав. К. Е. Варашылаў аб'язджае войскі, вітае байцоў, камандзіраў і палітработнікаў са святам 1 мая. У адказ на прывітанне наркома грыміць магутнае чырвонаармейскае «ура».

10 гадзін 15 мінут. Аб'езд войск закончан. Тав. К. Е. Варашылаў падымаецца на трыбуну маўзалея. Ад імя і па даручэнню ЦК ВКП(б) і ўрада СССР тав. К. Е. Варашылаў вітае працоўных з міжнародным святам 1 мая.

Тысячы маладых байцоў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, якія выстраіліся на плошчы, даюць у гэты дзень урачыстае абяцанне на вернасць свайму рабоча-сялянскаму ўраду, на вернасць вялікай совецкай радзіме.

Тав. К. Е. Варашылаў канчае сваю прамову. Магутнымі раскатамі грыміць «ура». Гучыць «Інтэрнацыянал». Гарматны салют патрасае паветра. Пачынаецца ўрачысты марш.

Марш адкрывае зводны полк начальніцкага састава ўпраўленняў Народнага камісарыята абароны. Затым ідуць слухачы ваенных акадэмій.

Магутны поступ байцоў Першай Маскоўскай стралковай дывізіі. Яны ўяўляюць сабой узор баявой падрыхтоўкі, якая робіць чырвоную пяхоту непераможнай сілай.

З трыбун горача вітаюць слаўныя часці войск НКВД і доблесных пагранічнікаў — пільных вартавых совецкіх граніц.

Згуртаванымі шарэнгамі праходзяць маракі чырвонасцяжнай Балтыкі, прадстаўнікі перадавога атрада магутнага Ваенна-Марскога Флота.

Горача вітаюць сабраўшыяся на трыбунах з'яўленне ўзброеных атрадаў маскоўскіх рабочых.

Ідуць лётчыкі і парашутысты. Сярод іх нямала жанчын.

У строгім раўненні праходзяць чырвоныя коннікі, хавальнікі слаўных традыцый Першай Коннай арміі, створанай вялікім стратэгам пралетарскай рэвалюцыі таварышам Сталіным. З грукатам праносяцца тачанкі.

Бясшумна скальзяць па плошчы самакатчыкі. Імкліва імчацца матацыклісты.

З'яўляецца артылерыя, якая прыкоўвае да сябе ўсеагульную ўвагу, артылерыйскае ўзбранне Чырвонай Арміі — унушальна і рознастайна.

Парад першакласнай, магутнай тэхнікі заключаюць танкі.

К 12 гадзінам дня парад закончан.

Гэта быў незабыўны парад совецкіх багатыроў, якім народ даверыў магутную баявую тэхніку для абароны мірнай працы першай у свеце вялікай соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян.

ДЭМАНСТРАЦЫЯ НА КРАСНАЙ ПЛОШЧЫ

Грозныя іспалінскія танкі, узброеныя кулямётамі і гарматамі, апошнімі пакідаюць Красную плошчу. Услед за імі хлынулі бурныя патокі дэманстрантаў. Але агляд ваеннай магутнасці СССР яшчэ прадаўжаецца ў паветры. Над Гістарычным музеем паказваюцца самалёты. Імкліва пралятаюць эскадрыллі штурмавой і знішчальнай авіяцыі. Краіна соцыялізма надзейна абаронена з паветра. І дэманстранты і гледачы на трыбунах ля крэмлёўскіх сцен горача вітаюць гордых сокалаў Совецкай краіны.

...Заравам чырвоных сцягаў палыхае Красная плошча. Сотні тысяч дэманстрантаў напаўняюць плошчу гулам святочнага лікавання і радасных воклічаў. Адусюль нясецца магутнае «ура». Масквічы вітаюць знаходзячыхся на левым крыле маўзалея кіраўнікоў партыі і ўрада, шлюць словы любві і адданасці мудраму натхніцелю перамог соцыялізма таварышу Сталіну.

З выключнай цеплынёй і ўздымам вітаюць дэманстранты пасланцоў рабочага класа зарубежных краін і асабліва прадстаўнікоў геравічнага іспанскага народа. У адказ іспанцы і іншыя замежныя дэлегаты паднімаюць сціснутыя ў кулакі рукі, даючы абяцанне прадаўжаць барацьбу да поўнай перамогі над ворагам.

Дэманстранты з гордасцю нясуць плакаты і лозунгі, прысвечаныя Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскому Флоту.

Свяшчэнную нянавісць і гнеў выказваюць працоўныя наймітам японагерманскага фашызма — гнусным вырадкам трацкісцка-бухарынскай банды. Совецкі народ горача вітае слаўных работнікаў НКВД і іх баявога сталінскага наркома тав. Н. І. Ежова...

Тысячы транспарантаў і плакатаў паведамляюць аб набліжэнні знамянальнага дня 26 чэрвеня 1938 года, дня выбараў у Вярхоўны Совет РСФСР. Лозунгі заклікаюць мацаваць блок комуністаў і беспартыйных, правесці выбарчую кампанію арганізавана, паслаць у Вярхоўныя Советы Саюзных і Аўтаномных рэспублік доблесных патрыётаў нашай радзімы, непахісных барацьбітоў за шчасце рабочых і сялян, за соцыялізм, за справу Леніна—Сталіна.

Апошняй з Краснай плошчы ўходзіць замежная дэлегацыя. Яна выстрайваецца ў калону і пад чырвоным баявым сцягам геравічнай Іспаніі праходзіць каля маўзалея. Рукі падняты ўверх і сціснуты ў кулак. Яна горача вітае вялікага Сталіна і членаў совецкага ўрада, вялікі совецкі народ.

Чатыры гадзіны прадаўжалася шэсце першамайскіх калон — гэта выдатная дэманстрацыя маральнага і палітычнага адзінства вялікага народа краіны соцыялізма. Праз Красную плошчу прайшло звыш паўтара мільёны чалавек.

СВЯТА МАГУТНАСЦІ І АДЗІНСТВА

Калі вясенняе ласкавае сонца сагрэла зямлю, калоны, расквечаныя яркасцю ўсіх радасных фарб, выстраіліся на вуліцах Менска. Запалымнелі чырвоныя сцягі. Сцягі, партрэты Леніна, Сталіна і верных саратнікаў яго—над калонамі над горадам.

11 гадзін. На плошчы Леніна і на вуліцах каля яе прагучала каманда: «Смірна!» Цішыня скавала стройныя рады байцоў пяхоты, кавалерыстаў, артылерыстаў, танкістаў.

Камандуючы войскамі Беларускай ваеннай акругі камкор Кавалёў, член Ваеннага совета камкор Голікаў, выконваючы абавязкі сакратара ЦК КП(б)Б тав. Волкаў павіншавалі байцоў, камандзіраў і палітработнікаў з вялікім пралетарскім Першым мая.

Магутнымі хвалямі перакатваецца па плошчы, па вуліцах чырвонаармейскае баявое «ура».

Надышла самая ўрачыстая мінута.

—... За справу соцыялізма і братэрства народаў не шкадаваць ні сваіх сіл, ні самога жыцця...—маладыя галасы байцоў Чырвонай Арміі зліваюцца ў адзін магутны голас—голас совецкага народа і велічна гучаць над плошчай словы чырвонай прысягі.

Пачынаецца Першамайскі марш войск. Чотка праходзяць курсанты Менскага ваеннага вучылішча. За імі—часці нашай слаўнай пяхоты.

Новыя прывітанні, воклічы гучаць на плошчы: праходзяць мужныя вартавыя рубяжоў радзімы—пагранічнікі.

Праімчалася чырвоная конніца. І як толькі заціх цокат капытоў, гул металу хлынуў на плошчу. Артылерыя! Зяюць на сонцы грозныя гарматы. А на тварах маладых артылерыстаў—весялосць.

Узрыў радасці і захаплення выклікае марш танкаў. Уздрыгвае зямля і сатрасаецца паветра ад руху і гулу магутных сталёвых крэпасцей.

За часцямі слаўнай Чырвонай Арміі, якія прадэманстравалі абаронную магутнасць Совецкага Саюза, праходзяць узброеныя атрады металістаў, будаўнікоў, чыгуначнікаў, студэнтаў, каманды супроцьпаветранай і хімічнай абароны, юныя варашылаўскія стралкі, авіямадэлісты. Атрады працоўных Менска дэманструюць гатоўнасць совецкага народа стаць у кожную мінуту на абарону свяшчэннай зямлі нашай соцыялістычнай радзімы.

З вясёлымі песнямі ўступаюць на плошчу дэманстранты. Першымі праходзяць школьнікі Менска. Над калонай радаснай дзетвары партрэт таго, хто даў ім шчаслівае дзяцінства, адкрыў найвялікшыя перспектывы ў авалоданні ведамі, культурай, — абвіты сцягамі і кветкамі партрэт вялікага Сталіна.

Дзве калоны з сумежных вуліц зліваюцца на плошчы ў адзін паток—крочаць дэманстранты Сталінскага і Кагановіцкага раёнаў Менска. У першых радах—стаханаўцы завода імя Кірава, фабрыкі «Окцябр», завода «Большэвік», фабрыкі імя Кагановіча.

Чырвоныя сцягі палыхаюць над калонамі. І між сцягаў — барэльефы Леніна і Сталіна.

Народ Совецкай Беларусі славіць вялікага правадыра, тварца шчасця—Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна. Партрэты таварыша Сталіна, кіраўнікоў партыі і ўрада нясуць дэманстранты. Песнямі выказваюць падзяку вялікаму Сталіну за шчаслівае жыццё працоўныя сталіцы Совецкай Беларусі.

Мовай лозунгаў вітаюць дэманстранты Першае мая — дзень міжнароднай пралетарскай салідарнасці, дзень баявога агляду рэволюцыйных сіл пралетарыята, вітаюць геравічны народ Іспаніі, народ Кітая, якія змагаюцца супроць фашысцкіх агрэсараў. Мовай лозунгаў калоны працоўных заклікаюць мацаваць сталінскі блок комуністаў і беспартыйных, абраць у Вярхоўны Совет БССР лепшых сыноў нашай партыі і народа. Мовай лозунгаў і плакатаў вітаюць працоўныя сталіцы БССР слаўных чэкістаў на чале са сталінскім наркомам тав. Ежовым, заклікаюць да мацавання большэвіцкай пільнасці.

Калоны спыняюцца перад урадавай трыбунай і групы моладзі выконваюць беларускія танцы, танцы народаў СССР.

Ідзе совецкае студэнцтва, інтэлігенцыя. Плакатамі і лозунгамі яны выказваюць удзячнасць вялікаму Сталіну, партыі за тое, што наша моладзь, увесь наш народ можа развіваць свае творчыя здольнасці, авалодваць вышынямі культуры.

З сотнямі сцягоў перадавыя людзі вытворчасці, стаханаўцы фабрык і заводаў адкрываюць шэсце дэманстрантаў Варашылаўскага раёна. Наперадзе—гіганцкія бюсты Леніна і Сталіна. За імі—11 дзяржаўных гербаў нацыянальных рэспублік Совецкага Саюза. Дэманстранты падкрэсліваюць непарыўную дружбу і з'яднанасць народаў нашай радзімы.

Яркімі плакатамі, цікавымі маляўнічымі макетамі працоўныя Менска адлюстроўваюць клопаты народаў Совецкай Беларусі аб абароне граніцы і непрыступнасць граніц СССР.

Калоны фізкультурнікаў — юнакоў і дзяўчат, веласіпедыстаў і матацыклістаў завяршылі дэманстрацыю.

Некалькі гадзін праз плошчу Леніна каля ўрадавай трыбуны праходзілі калоны працоўных Менска, дэманструючы магутнасць і адзінства совецкага народа, сваю гатоўнасць да новых баёў за комунізм.

Звыш ста тысяч працоўных сталіцы Совецкай Беларусі прынялі ўдзел у дэманстрацыі.

Першамайскі парад у Менску. НА ЗДЫМКУ (злева направа): начальнік Менскага гарнізона тав. КУЗНЯЦОЎ, нарком унутраных спраў БССР тав. БЕРМАН, старшыня Ваеннага Совета БВА тав. КАВАЛЁЎ, сакратар ЦК ЛКСМБ тав. ЕЛАГІН і вык. абав. сакратара ЦК КП(б)Б тав. ВОЛКАЎ на ўрадавай трыбуне.

Фото Б. Вернер (БСФ).

Першым кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР вылучан арганізатар нашых перамог Іосіф Вісарыёнавіч СТАЛІН

ВІЦЕБСК

На передвыбарчым сходзе рабочых і служачых віцебскай швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР аднагалосна вылучаны таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, Л. М. Кагановіч, К. Е. Варашылаў, М. І. Калінін, Н. І. Ежоў, А. А. Андрэеў, Н. К. Крупская, А. А. Волкаў, А. Ф. Кавалёў.

Сход рабочых і служачых шчаціннага камбіната імя Куйбышэва, на якім прысутнічала 1.100 чалавек, з велізарным энтузіязмам аднадушна вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР вялікага правадыра народаў таварыша І. В. Сталіна і яго слаўных саратнікаў таварышоў В. М. Молатава, Л. М. Кагановіча, К. Е. Варашылава, М. І. Калініна, Н. І. Ежова, А. А. Жданава, А. А. Андрэева, В. Я. Чубара, С. В. Касіора, А. І. Мікаяна. Сход вылучыў таксама кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР выконваючага абавязкі першага сакратара ЦК КП(б)Б тав. А. А. Волкава.

ГОМЕЛЬ

На гомельскім паравозарамонтным заводзе адбыўся перадвыбарчы агульназаводскі сход рабочых і служачых па вылучэнню кандыдатур у склад Вярхоўнага Совета БССР.

Рабочыя, служачыя, інжынеры і тэхнікі аднадушна вылучылі кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР таварыша І. В. Сталіна, таварышоў В. М. Молатава, М. І. Калініна, Л. М. Кагановіча, К. Е. Варашылава, Н. І. Ежова, А. А. Жданава, Н. С. Хрушчова, А. І. Мікаяна, А. А. Волкава і Б. Д. Бермана.

МАГІЛЕЎ

На перадвыбарчым сходзе рабочых і служачых магілёўскага чыгуначнага вузла аднадушна вылучаны кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, Л. М. Кагановіч, К. Е. Варашылаў, Н. І. Ежоў, М. І. Калінін і А. А. Волкаў.

РЭЧЫЦА

3 мая адбыўся перадвыбарчы сход рабочых і служачых запалкавай фабрыкі імя X Кастрычніка. Сход аднадушна і з вялікім уздымам вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР таварыша І. В. Сталіна, таварышоў В. М. Молатава, Л. М. Кагановіча, К. Е. Варашылава, Н. І. Ежова і А. А. Волкава.

ХОЙНІКІ

Перадвыбарчы сход членаў профсаюза палітасветработнікаў, работнікаў дзяржаўных устаноў, кааперацыі і членаў саматужна-прамысловых арцелей вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР таварышоў І. В. Сталіна, В. М. Молатава, М. І. Калініна, К. Е. Варашылава, Л. М. Кагановіча і А. А. Волкава.

САМАЯ ВОСТРАЯ І САМАЯ МОЦНАЯ ЗБРОЯ НАШАЙ ПАРТЫІ

В. МАЛІН,
заг. аддзелам друку і выдавецтваў ЦК КП(б)Б.

Пятае мая — Дзень большэвіцкага друку. Увесь совецкі народ адзначае гэту знамянальную дату ў гісторыі рабочага большэвіцкага друку, у гісторыі яго барацьбы супроць усіх ворагаў партыі і працоўных мас, за чыстату і незаплямленасць марксісцка-ленінскага сцяга, за перамогу соцыялізма ў нашай краіне.

У нашай совецкай краіне друк з'яўляецца магутнай зброяй арганізацыі і асветы працоўных мас, велізарнай сілай у справе выхавання мас у комуністычным духу, арганізацыі мас вакол большэвіцкай партыі. Наш друк, створаны і выпеставаны Леніным і Сталіным, з'яўляецца ў руках большэвіцкай партыі велізарным сродкам для згуртавання мільённых мас працоўных нашай вялікай радзімы на барацьбу за заваяванне новых перамог комунізма. Сілу большэвіцкага друку, крыніцу яе ўплыву і поспехаў Ленін і Сталін заўсёды бачылі ў цеснай арганізацыйнай сувязі газеты з масамі.

Узорам для ўсяго нашага друку, для ўсіх работнікаў газет была і ёсць наша сталінская «Правда» — орган Цэнтральнага Камітэта нашай партыі. «Правда» — гэта любімейшая ўсім нашым народам газета. І гэта падкрэслівае лішні раз толькі тое, што «Правда» няўхільна выконвае ленінска-сталінскае ўказанне аб масавасці газеты. Яна сотнямі тысяч ніцей звязана з рабочымі, сялянамі, інтэлігенцыяй нашай краіны; аб гэтым гаворыць змест кожнага нумара «Правды». Праўдзіст—гэта слова заўсёды гучала і прадаўжае гучаць як увасабленне адданасці справе партыі Леніна—Сталіна, як увасабленне непрымірымасці ў барацьбе з ворагамі народа, як увасабленне палкага барацьбіта, агітатара, масавіка, арганізатара мас. Слаўныя традыцыі «Правды», ленінска-сталінскі стыль метад яе работы заўсёды павінны быць прыкладам у рабоце кожнага работніка газеты.

У нашай совецкай краіне, чаго няма ні ў адной іншай краіне свету, створаны выдатныя ўмовы і магчымасці для плённай работы друку. Гэта залатымі літарамі запісана ў нашай Сталінскай Канстытуцыі.

На аснове гэтых цудоўных створаных магчымасцей расце, развіваецца і мацнее наш большэвіцкі друк. А рост друку, газет, кніг, журналаў у совецкай краіне сапраўды велізарны. У гэтым росце відзён ярка рост культуры народаў СССР, ён з'яўляецца жывым і яркім доказам перамогі соцыялізма ў нашай краіне. У царскай Расіі ў 1913 г выдавалася ўсяго толькі 859 газет з тыражом у 2.729 тыс., а ў СССР у 1937 г. выдавалася 8.521 газета з тыражом каля 36.197 тыс. экз. Газеты ў СССР выходзяць на 69 мовах.

Вялізны па свайму размаху і рост друку ў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспубліцы. Работнікі друку БССР, працоўныя масы рэспублікі з законнай гордасцю адзначаюць Дзень друку новымі фактамі праяўляемых клопатаў нашай вялікай партыяй аб выкарыстоўванні грамадзянамі БССР гарантаваных Сталінскай Канстытуцыяй праў. У гэтым годзе, па рашэнню Сталінскага Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), у БССР пачалі выходзіць чатыры новыя абласныя газеты: магілёўская, віцебская, гомельская, палеская на беларускай мове і новая рэспубліканская комсамольская газета «Сталинская молодежь» на рускай мове.

У гэтым годзе, па рашэнню ЦК ВКП(б), пачалі выходзіць тры новыя раённыя газеты ў БССР: магілёўская, віцебская, гомельская, новая газета на БелДРЭС «Сталінец». У БССР у сучасны момант выдаюцца 8 рэспубліканскіх газет, 4 журналы, 4 абласныя газеты, 92 раённыя газеты, 90 фабрычна-заводскіх шматтыражак і каля 15 тысяч насценных газет. Гэта велізарная сіла ў руках партыі.

Увесь наш друк у мінуўшым годзе здаваў сур'ёзнейшы экзамен. Адказнейшыя і вялікія задачы выраашалі і выконвалі работнікі большэвіцкага друку пры правядзенні работы па растлумачэнню найшырэйшым масам працоўных найвялікшага гістарычнага значэння Сталінскай Канстытуцыі, самай дэмакратычнай Канстытуцыі ў свеце, па падрыхтоўцы і правядзенню выбараў у Вярхоўны Совет СССР, па забеспячэнню поўнай перамогі сталінскага блока комуністаў і беспартыйных на выбарах, па падрыхтоўцы і правядзенню дваццацігоддзя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, па выкананню рашэнняў лютаўска-сакавіцкага (1937 г.) Пленума ЦК ВКП(б) аб авалоданні большэвізмам і выкрыцці япона-германскіх трацкісцка-бухарынскіх і нацыяналістычных шпіёнаў, дыверсантаў і забойцаў.

Адказнейшыя і вялікія задачы ўскладзены на друк у справе выканання рашэнняў студзеньскага (1938 г.) Пленума ЦК ВКП(б) у справе правядзення выбараў кіруючых парторганаў, а таксама ў справе правядзення выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Адказнасць ускладзеных партыяй задач на работнікаў друку велізарна. Гэта тым больш неабходна падкрэсліць, што пэўная частка работнікаў друку БССР не здала сур'ёзнага палітычнага экзамена і не апраўдала высокага давер'я, якое ім аказвае партыя, і што не ўсе яшчэ газеты поўнасцю апраўдваюць сваё высокае назначэнне калектыўнага прапагандыста, агітатара і арганізатара мас.

Узяць хоць-бы такое важнейшае пытанне, як асвятленне ў газетах пытанняў партыйнага жыцця. Вядома, што Цэнтральны Камітэт ВКП(б) ускрыў сваім рашэннем ад 15 сакавіка 1938 г. «Аб асвятленні ў газетах пытанняў партыйнага жыцця» буйнейшыя недахопы ў рабоце газет «Звязда» і «Советская Белоруссия» — гэта бессістэмнасць і павярхоўнасць у асвятленні пытанняў партыйнага жыцця, і асабліва нездавальняючае асвятленне гэтымі газетамі работы парторганізацый па выкананню рашэння студзеньскага (1938 г.) Пленума ЦК ВКП(б).

Адзначаныя ў рашэнні ЦК ВКП(б) ад 15 сакавіка 1938 года недахопы ў рабоце газет «Звязда» і «Советская Белоруссия» не ў меншай ступені адносяцца да большасці раённых газет БССР. Выпадковыя заметкі на партыйныя тэмы, пераважна перадрукоўкі з іншых газет, павярхоўнасць і бессістэмнасць—усё гэта яшчэ да гэтага часу не зжыта з практыкі работы рэдакцый газет. Напрыклад, рэдакцыя веткаўскай раённай газеты «За большэвіцкія тэмпы» за тры месяцы (студзень—сакавік 1938 г.) не надрукавала ніводнай заметкі на партыйную тэму. У пухавіцкай раённай газеце са студзеня па сакавік месяц надрукаван толькі адзін перадавы артыкул на партыйную тэму і адна заметка. Таксама вельмі слаба асвятляюць партыйнае жыццё асвейская, прапойская, бярэзінская раённыя газеты і інш.

Некаторыя нашы работнікі газет самі яшчэ да гэтага часу не аслабаніліся ад ідыёцкай хваробы бяспечнасці і не праніклі пачуццём адказнасці за кіраўніцтва газетай, журналам і тым самым граюць на руку толькі ворагам. Ні чым іншым, як наяўнасцю палітычнай бяспечнасці, нельга вытлумачыць тое, што ў радзе газет мы мелі пад няўінным выглядам апячатак вылазкі варожых элементаў (асвейская, прыбінская раённыя газеты).

Павышэнне пільнасці не на словах, а на справе для ўсіх нашых работнікаў газет азначае ўменне распазнаваць і зрываць маскі з сапраўдных ворагаў партыі, рабочага класа і ўсіх працоўных нашай радзімы, выкрываць шкурнікаў, кар'ерыстаў, перастрахоўшчыкаў.

Кожны работнік друку павінен памятаць з усёй сілай аб тым, што разгортванне самай суровай крытыкі і самакрытыкі ў рабоце газет ёсць галоўны сродак для ўмацавання работы самой газеты, для ўмацавання яе сувязей з масамі.

Актыўна ўдзельнічаючы ў правядзенні выбараў кіруючых парторганаў, работнікі друку абавязаны сістэматычным асвятленнем выбарчай кампаніі на старонках газет і журналаў дапамагчы ўсямерна партыйным арганізацыям выбраць у кіруючыя партыйныя органы правераных большэвікоў, бязмежна адданых нашай партыі, выпрабаваных у барацьбе з ворагамі народа і здольных да канца абараняць справу комуністычнай партыі.

Вялікія і адказныя задачы ўскладзены на друк у справе падрыхтоўкі і правядзення выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Задачы правядзення выбараў у Вярхоўны Совет БССР зараз больш ускладнены, размах агітацыйна-прапагандысцкай і арганізацыйнай работы значна шырэйшы і задача дабіцца яшчэ большай перамогі блока комуністаў і беспартыйных на выбарах велізарна.

Рэспубліканскія, абласныя, раённыя газеты і ўвесь нізавы друк абавязаны ўсебакова весці сваю работу па паказу перамог соцыялістычнага будаўніцтва ў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспубліцы, паказу росквіту культуры, нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу, паказу росту матэрыяльнай забяспечанасці жыцця працоўных і на гэтай аснове мабілізоўваць творчую палітычную актыўнасць мас на вырашэнне палітычных і гаспадарчых задач.

Прыцягненне шырокага аўтарскага актыва да сістэматычнага ўдзелу ў газетах, вылучэнне з новага, вырасшага актыва маладых, таленавітых, здольных работнікаў на кіруючую работу ў газеты і журналы ёсць пярвейшая задача рэдакцый газет, журналаў і выдавецтваў. Святы абавязак большэвіцкіх работнікаў газет—дапамагчы маладым кадрам у іх палітычным росце і дзелавой кваліфікацыі.

Дзень друку ўсе рэдакцыі газет і журналаў павінны сустрэць рашучым паляпшэннем пастаноўкі работы з пісьмамі працоўных. У рэдакцыі газет дзесяткамі тысяч паступаюць пісьмы. У рэдакцыю газеты «Звязда» ў 1937 годзе паступіла 37.805 пісем. Які іх лёс? Ці ўсе працоўныя, паслаўшыя пісьмы, атрымалі на іх адказы? Здавалася-б, прамы абавязак рэдакцыі на ўсе пісьмы даць вычарпальны адказ. У сапраўднасці-ж у нас ні адна рэдакцыя не забяспечыла большэвіцкай пастаноўкі работы з пісьмамі працоўных. У рэдакцыі газеты «Звязда» месяцамі пісьмы ляжаць без адказу, на мноства пісем зусім не адказана. Не лепш справа і ў рэдакцыі газеты «Советская Белоруссия» і ў іншых газетах. Адною з канкрэтных мер па паляпшэнню дзейнасці газет і іх сувязі з масамі з'яўляецца патрабаванне да рэдакцый газет і журналаў арганізаваць на справе, па-сапраўднаму, па-большэвіцку работу з пісьмамі працоўных.

Дзень большэвіцкага друку работнікі газет у БССР адзначаюць згуртаванасцю сваіх радоў, значным ачышчэннем кадраў работнікаў друку ад гнусных паследышаў трацкісцка-бухарынскай і нацыяналістычнай банды агентаў германа-польскага фашызма.

Але работнікі друку БССР зрабілі-б злачынства, калі-б заявілі, што кадры газет, журналаў і выдавецтваў ужо ачышчаны і цалкам умацаваны. Не. Задача далейшага ачышчэння кадраў работнікаў друку ад прытаіўшыхся і пакуль яшчэ нявыкрытых ворагаў і іншых чужых элементаў астаецца важнейшай і галоўнейшай нашай задачай; таксама астаецца першаступеннаю задача ўмацавання кадраў рэдакцый і выдавецтваў праверанымі работнікамі, барацьба за павышэнне іх ідэйнага ўзроўню, пашырэнне палітычнага кругагляду, арыентыроўкі, барацьба за навядзенне большэвіцкага парадку ў нашых рэдакцыях, выдавецтвах, друкарнях.

У мэтах паляпшэння якасці работы газет, журналаў, неабходна ўмацаванне кіраўніцтва газетамі з боку райкомаў партыі. Не сакрэт, напрыклад, што Жлобінскі РК КП(б)Б цікавіцца работай газеты толькі тады, калі ў газеце з'яўляецца тая ці іншая памылка, або Кіраўскі райком, які таксама не цікавіцца тым, як працуе калектыў рэдакцыі, або Асвейскі РК КП(б)Б. Трэба рашуча палепшыць якасць кіраўніцтва з боку райкомаў КП(б)Б нізавым друкам — вось у чым важнейшая задача.

Перад большэвіцкім друкам — вялікае поле дзейнасці. Задачы, што стаяць перад работнікамі друку, адказныя і пачэсныя. Ва ўсведамленні поўнай адказнасці і гонару за даручаную справу ўсе работнікі друку з ускладзенымі на нас партыяй і совецкім урадам задачамі справяцца.

В. І. ЛЕНІН за «Праўдой». Здымак 1918 года.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ЗА БОЛЬШЭВІЦКУЮ КРЫТЫКУ

Прайшоў год з часу выбараў партыйных органаў. За гэты год партыя пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна, узброеная гістарычным рашэннем лютаўска-сакавіцкага пленума ЦК ВКП(б) 1937 года, правяла велізарную работу па ачыстцы сваіх радоў ад ворагаў народа, ад трацкісцка-бухарынскіх агентаў фашызма.

У справаздачным дакладзе парторг Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР тав. Рубінштэйн павінен быў даць ясны адказ, як партарганізацыя Упраўлення змагалася за правядзенне ў жыццё рашэнняў партыі, як яна выхоўвала комуністаў і беспартыйных у духу рэволюцыйнай большэвіцкай пільнасці, якія мерапрыемствы праводзіліся па авалоданню большэвізмам, як партарганізацыя змагалася за соцыялістычнае мастацтва, за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва ў галіне мастацтва.

На ўсе гэтыя і рад іншых пытанняў партсход адказу не атрымаў. Дакладчык пастараўся абыйсці гэтыя пытанні, а калі некаторыя з іх і былі закрануты, дык павярхоўна. Даклад наогул быў павярхоўны, дакладчык гаварыў «аб усім патроху», несамакрытычна, без аналізу прычын недахопаў, якіх шмат у рабоце партарганізацыі. Дакладчык не мабілізаваў партарганізацыю на вырашэнне адказнейшых мастацка-палітычных задач. Даклад яго быў пабудаваны ў духу агульнай канстатацыі фактаў. Ніякага палітычнага аналізу, абагульнення і вывадаў для партарганізацыі ён не даў.

У дакладзе не ўскрыты сур'ёзнейшыя прычыны ганебнага зрыву пабудовы Тэатра оперы і балета, калектыў якога да гэтага часу не мае памяшкання і належным чынам не скарыстоўваецца.

Партарганізацыя да гэтага часу не ўзначаліла падрыхтоўкі да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве.

Нічога не рабілася па вылучэнню ў апарат Упраўлення новых, давёўшых сваю здольнасць на вытворчасці, маладых кадраў.

У спрэчках па справаздачнаму дакладу выказаліся ўсе члены партыі.

Выступаючыя тт. Уханаў, Патапейка, Мельнікаў і другія гаварылі аб тым, што партарганізацыя цягнулася ў хвасце падзей і не ўзначаліла як след кіраўніцтва фронтам мастацтваў—толькі складалі планы, а ў жыццё іх не праводзілі.

Вывучэнне гісторыі партыі ў партарганізацыі сарвана. Не займалася партгкіраўніцтва і вылучэннем новых кадраў. Сярод работнікаў тэатра слаба была разгорнута крытыка недахопаў работы Упраўлення. Да гэтага часу не наладжана вытворчае жыццё, пытаннямі якога партарганізацыя займалася ад выпадку да выпадку. Не ставілася задача падцягвання адстаючых галін мастацтва.

Указвалася, што пры вывучэнні памылак таго ці іншага члена партыі не было прынцыповага большэвіцкага аналізу іх, не было правільнай крытыкі, таму быў дапушчан рад памылак пры выключэнні з радоў партыі і вынясенні партспагнанняў (Дварэцкі, Прагін)

Не было належнага кіравання комсамолам. Гаспадарчым становішчам тэатраў партарганізацыя таксама не цікавілася, а гэта самы запушчаны ўчастак, які патрабуе ўвагі да сябе. З боку райкома партыі не было належнай дапамогі ў рабоце партарганізацыі Упраўлення.

Выступаючыя адзначалі, што партарганізацыя недастаткова мабілізавала сябе і масу работнікаў на ліквідацыю вынікаў шкодніцтва, не ўзняла на належную вышыню пытанняў мастацтва, не арганізавала работу калектыва, дрэнна дапамагала здольным работнікам, якія апраўдалі сябе на вытворчасці. Дрэнна абстаіць справа з дысцыплінай, няма кантролю за выкананнем прынятых пастаноў. Да гэтага часу не наладжана работа з пісьменнікамі, што перашкаджае як работнікам Упраўлення па справах мастацтваў, так і пісьменнікам у іх рабоце.

Тав. Граблеўскі (ад райкома партыі) ўказаў, што работа партарганізацыяй праводзілася не ў адпаведнасці з рашэннямі лютаўска-сакавіцкага і студзеньскага пленумаў ЦК ВКП(б); не створана група спачуваючых, ніякай работы не праводзілася з беспартыйнымі, а таксама і членамі партыі.

Як дакладчык, так і выступаючыя ў спрэчках таварышы адзначалі, што партарганізацыя дапусціла буйнейшую палітычную памылку, калі пры выключэнні з партыі ворага народа Ткачэвіча не адняла ў яго партыйнага білета, чым не толькі парушыла статут партыі, але і паказала прытупленне большэвіцкай пільнасці. Выступаючыя адзначалі памылковасць вынясення на аснове неправераных матэрыялаў партспагнання тав. Прагіну і выключэння з партыі тав. Дварэцкага. У адносінах да тав. Прагіна партарганізацыя выправіла сваю памылку, адмяніўшы сваё рашэнне, у адносінах тав. Дварэцкага памылка партарганізацыі была выпраўлена Камісіяй партыйнага кантролю.

Усе гаварылі аб слабай падрыхтоўцы Упраўлення да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Гэта адказнейшая палітычная кампанія не знайшла належнага адлюстравання ў рабоце партыйнай арганізацыі. Партарганізацыі зараз-жа неабходна ўзначаліць мастацкі фронт, мабілізаваўшы партыйных і непартыйных большэвікоў, комсамольскія арганізацыі мастацкіх прадпрыемстваў і арганізацый на ганаровае выкананне гэтай адказнейшай задачы.

Выступаючыя таварышы гаварылі аб адсутнасці работы па авалодванню большэвізмам. Адставанне фронта мастацтваў ад іншых галін соцыялістычнага будаўніцтва тлумачыцца тым, што члены партыі, якія ўзначальваюць той ці іншы сектар мастацтва, не авалодалі большэвізмам. Асноўная задача кіраўнікоў мастацкага фронта састаіць у тым, каб смела, рашуча і канчаткова ліквідаваць рэшткі подлага шкодніцтва ворагаў народа, каб да канца выкрыць і выкарчаваць ахвосце фашысцкіх агентаў, як-бы яно ні маскіравалася.

Мастацтва служыць пролетарыяту ў яго барацьбе за пабудову комуністычнага грамадства і яно павінна быць пастаўлена на службу пролетарыята. Развіццё вытворчых сіл соцыялістычнага грамадства стымуліруе таксама і развіццё мастацтваў. І ў галіне мастацтваў мы маем вялікія дасягненні, але яны былі-б куды большымі, калі-б на гэтым фронце лепш працавалі большэвікі.

Сход прызнаў работу партарганізацыі Упраўлення нездавальняючай.

Тайным галасаваннем парторгам арганізацыі абран тав. Мельнікаў А. Н.

А. Г. ВАРАШЫЛАЎ.

СЛОВА МАЛАДЫХ ПІСЬМЕННІКАЎ

Ворагі народа, якія доўгі час арудвалі ў кіраўніцтве ССПБ, усяляк імкнуліся сарваць рост маладой літаратуры. Ледзь прыкмячалі яны здольнасці ў пачынаючага пісьменніка з народных мас, як адразу-ж прыкладалі да яго свае брудныя рукі двурушнікаў і так альбо інакш затоптвалі яго.

Гнусныя гэтыя прадажныя пісакі выкрыты.

Здавалася-б, што кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў павінна было-б паставіць асноўнай задачай сваёй работы выхаванне маладых пісьменнікаў. Але рост кадраў Саюз пісьменнікаў прадаставіў цякучасці. «Полымя рэволюцыі» хоць і змяшчае творы асобных маладых таварышоў, але не дапамагае гэтым таварышам у творчым росце, не цікавіцца іх лёсам. Яны прадастаўлены самім сабе.

Праўда, у апошні час на кожным пасяджэнні праўлення багата гутарак ідзе аб маладой літаратуры і яе прадстаўніках. «Дапамагаць», «выхоўваць», «падтрымліваць» — гэтыя словы на ўсе лады скланяюцца на праўленнях і пленумах. Створан літаратурны габінет, які кансультуе пачынаючых пісьменнікаў. Прынята некалькі чалавек у кандыдаты Саюза пісьменнікаў. Але-ж не трэба нават і прыглядацца для таго, каб сказаць, што нічога асабліва не змянілася ў бок лепшага. Усяго зробленага яшчэ далёка недастаткова. Работы габінета малады пісьменнік не адчувае (асабліва перыферыйны). Гутарка ідзе не аб асабовай кансультацыі, а аб масавай рабоце па арганізацыі ў гарадах Беларусі творчых літаратурных гурткоў і г. д. А прынятыя ў Саюз пісьменнікаў адчуваюць сябе так як і раней, калі не горш. На першых кроках іх дзейнасці асобныя старэйшыя пісьменнікі дапамагалі ім парадамі, крытыкай, а цяпер яны пазбаўлены і гэтай дапамогі.

У апошні час надрукавана шмат новых твораў маладых пісьменнікаў — Жаўрука, Кандрацені і інш. — але ні аднаго крытычнага артыкула не знойдзеш пра гэтых таварышоў. А гэтыя артыкулы знаёмілі-б чытача з творчасцю маладога пісьменніка, трапнай парадай дапамагалі-б пісьменніку больш упэўнена станавіцца на ногі ў літаратуры. Масцітыя крытыкі лічаць, мусіць, ніжэй сваёй годнасці пісаць аб маладых невядомых таварышах. Хваліць карыфеяў і спакойней і выгадней: тут нельга памыліцца. Творы маладых яны проста не чытаюць і не цікавяцца імі, не хочуць зразумець і дапамагчы выказаць тое новае, што імкнуцца сказаць гэтыя таварышы.

Наш народ надзвычай таленавіты. Аб гэтым сведчыць бурнае развіццё народнай творчасці, рост маладой літаратуры. Няма ні адной раённай газеты, дзе-б не друкаваліся вершы, апавяданні, нарысы дасюль невядомых чытачу таварышоў. У літаратуры выявілася нямала здольных людзей, якія з часам вырастуць у добрых пісьменнікаў. Але бяда ў тым, што сярод часткі старэйшых пісьменнікаў існуе недаацэнка маладых кадраў, няве'е ў іх сілы. Гэта, безумоўна, шкодная з'ява, якая вельмі хутка будзе разбіта. Моладзь, вырасшая і выхаваная ў совецкіх умовах, беззаветна адданая сваёй радзіме, слаўнай партыі Леніна — Сталіна, зможа і дасць таленавітыя творы пра нашу цудоўную эпоху. Трэба толькі смялей вылучаць маладыя кадры, трэба пасылаць асобных таварышоў на вучобу, дапамагаць ім вывучыць сваю краіну, братнія рэспублікі, знаёміць іх з гіганцкім будаўніцтвам у краіне, з культурнымі багаццямі Совецкага Саюза.

Пастанова аб скліканні канферэнцыі маладых пісьменнікаў вынесена пленумам даўно. На гэтай канферэнцыі неабходна было-б наладзіць абгаварэнне творчых пытанняў, перспектывы росту літаратуры, пагаварыць аб многім, што наспела за апошнія годы. Канферэнцыя, безумоўна, прынесла-б вялікую карысць. Але праўленне чамусьці дасюль не правяло ў жыццё гэтага мерапрыемства, якое ажывіла-б і дапамагло наладзіць работу Саюза пісьменнікаў.

Праўленне нават не склікала агульнага схода ўсіх беларускіх совецкіх пісьменнікаў, на якім зрабіла-б падагульненне вопыту работы па падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет СССР, а між тым надыходзяць выбары рэспубліканскага Вярхоўнага Совета і да гэтай важнейшай палітычнай кампаніі неабходна падрыхтаваць усю масу літаратараў.

Безумоўна, работу Саюза пісьменнікаў трэба неадкладна перабудаваць і перабудаваць не на словах, а на справе. З літаратурнай канцылярыі Саюз пісьменнікаў трэба ператварыць у сапраўдную творчую арганізацыю.

У. КРАЎЧАНКА. П. ПАНЧАНКА.

Першамайская дэманстрацыя ў Менску. Артысты Тэатра оперы і балета на дэманстрацыі. Фота Грунтфеста.

Першамайская дэманстрацыя ў Менску. НА ЗДЫМКУ: калона дэманстрантаў. Фото Мазелева (БСФ).

ВЕРШЫ Б. САСНОЎСКАГА

Нарадзіўся Б. Сасноўскі ў 1917 годзе ў в. Ніўкі, Лагойскага раёна. Скончыў сярэднюю школу ў Лагойску ў 1936 годзе. Больш года працаваў у раённай газеце «Чырвоная Лагойшчына». Тамжа надрукаваў першыя свае вершы. Большасць вершаў пачынаючага паэта—пра заможнае калгаснае жыццё, пра знатных людзей калгаса.

Ва ўсіх калгасных вершах Б. Сасноўскага арганічна прысутнічае матыў адданасці радзіме, партыі, правадыру таварышу Сталіну.

Вершы Б. Сасноўскага друкаваліся ў газеце «Чырвоная змена» і ў журнале «Полымя рэволюцыі».

ПЕРШАМАЙСКІМ ДНЁМ

Блакітнае ранне. Урачыста
Вясновае сонца нам свеціць.
На вуліцы выйшлі ўсе чыста—
Старыя, падлеткі і дзеці.
Сцягі агнявыя навокал,
Як парусы, узняты на моры.
Мы песні спяваем—далёка
Імчацца яны у прасторы,
Плывуць у бязмежныя далі
Над рэкамі, полем, лясамі,
Да светлага Крэмля, дзе Сталін
Працуе, не спаўшы начамі,
Дзе думае мудрую думу
Наш бацька любімы і родны,
Каб дзеці без гора і суму
Жылі ў краіне свабоднай.

Мы славім яго, дарагога,
У песнях, што гімнамі сталі,
За нашае шчасце, якога
Стагоддзямі людзі шукалі.
Не раз на паноў і магнатаў
Народ паўставаў на змаганне.
Паліў ён маёнткі ў адплату
За слёзы, за здзек, катаванні.
А сіл у барацьбе неставала...
Зноў цемра душыла...Шлі годы..
Нам Ленін і друг яго Сталін
У Кастрычніку далі свабоду.
Звязда перамогі над светам
Палае на шчасце мільёнаў.
Квітнее Краіна Советаў
Пад сцягам агністым, чырвоным.

ВЯСЕЛЛЕ

Вяселле ў нашым калгасе,
(Уславім-жа песняй яго),—
Выходзіць стаханаўка Хася
За любага хлопца свайго.

Той хлопец жыве недалёка —
Па той бок шырокай ракі.
Прыгожы такі і высокі,
Як майскае сонца—такі.

На конях на сытых ён чынна
З братамі і роднай сястрой
Прыехаў да любай дзяўчыны —
Славутай нявесты сваёй.

Гаворку з дзядзькамі заводзіць.
Вітае сустрэчных усіх.
І бацька, і матка выходзяць
Гасцей сустракаць дарагіх.

Па вёсках вяселля такога
Не бачылі людзі нідзе.
Радню жаніха дарагога
Сам бацька ў святліцу вядзе.

За стол за дубовы саджае
Дачку ён сваю з маладым,
Са жбана віно налівае
І кажа, падносячы ім:

— За вас, дарагіх, яснавокіх,
Я гонар вялікі нясу,
Падымем-жа шклянкі высока
За нашу радзіму-красу!

За тых, хто нам сонейкам свеціць,
Хто шчасце людское куе,
За лепшага з лепшых у свеце,
За Сталіна, дзеці мае!

Усе госці з застолля ўсталі,
І вокліч як бура плыве:
— За роднага бацьку! Наш Сталін
Хай доўгія годы жыве!

Як хораша сёння, як люба,
І кружацца пары віхром, —
Гармонік, і скрыпка, і бубен
Да раніцы радуюць дом.

Вяселле—у нашым калгасе.
(Уславім-жа песняй яго!)
Выходзіць стаханаўка Хася
За любага хлопца свайго.

КАСТРЫЧНІК—МНЕ РАВЕСНІК

Мне шлюць паклоны нівы
І сонца ясна свеціць,—
Я самы найшчаслівы
Ва ўсім вялікім свеце.
Праходжу горда. Зоры
Шляхі мне свецяць ззяннем.
Квяцістыя прасторы,
Прыміце прывітанне!

У даль імчыся, песня,
Табе—дарогі насцеж.
Кастрычнік—мне равеснік,
Маё жыццё і шчасце.

У сонечным прыволлі
Усюды з ім я радам.
Нас разлучыць ніколі
Не ўдасца подлым гадам.
За веліч спраў змагацца
Мы будзем мужна, стойка.
Яму сягоння—дваццаць,
І мне таксама столькі.

У даль імчыся, песня,
Табе—дарогі насцеж.
Кастрычнік—мне равеснік,
Маё жыццё і шчасце.

Ідзе нас, дужых, сіла
Пад гул і рокат сталі.
Нас партыя ўзрасціла,
Вялікі бацька Сталін.
Наймудры, бацька родны,
Ты—цвет, ты наша юнасць,
Усіх краін народы
Цябе пяюць, шануюць.

У даль імчыся, песня,
Табе—дарогі насцеж.
Кастрычнік—мне равеснік,
Маё жыццё і шчасце.

— Ура!—табе крычу я,
Мой сябра яснавокі!
Няхай усе пачуюць
За межамі далёка.
Дарэмна там фашысты
Гармат наводзяць жэрлы,—
Змяцем усіх дачыста
Шакалаў крыважэрных.

У даль імчыся, песня,
Табе—дарогі насцеж.
Кастрычнік—мне равеснік,
Маё жыццё і шчасце.

МАЛАДАЯ СВЕЖАЯ СІЛА

Абагульваць гэтыя з'явішчы яшчэ рана, як рана шукаць ім прычын — ці то ва ўплывах нашага шматграннага жыцця, ці то ў больш глыбокай літаратурнай вучобе. Аднак, прачытаўшы рад твораў маладых аўтароў, хочацца адзначыць радаснае з'явішча — маладыя аўтары з першых сваіх апавяданняў не без поспеху намагаюцца авалодаць моцна зробленай фабулай. Нельга сказаць, каб тут была заслуга нашай крытыкі, хоць па паўзучым эмпірызме, па фатаграфічнаму апісальству нацдэмаўскіх твораў крытыка раз-па-раз біла, папярэджваючы маладых аўтараў аб гібельным уплыве гэтай літаратуры. Тлумачыць гэта з'явішча простым супадзеннем таксама нельга: занадта характэрная гэта рыса для маладых пісьменнікаў. Абмяжуемся пакуль-што тым, што адзначым гэта з'явішча як станоўчае і радаснае.

І яшчэ адна светлая рыска выпірае ў творчасці маладых пісьменнікаў — прынамсі, кажучы аб празаіках, у тав. Краўчанкі Усевалода і тав. Кандрацені Уладзімера: яны пішуць пра новага чалавека вёскі не «умозрительно», не па прынцыпу стварэння антыпода таму селяніну, якога яны калісь ведалі, а па прынцыпу паказу новых якасцей чалавека, якія яны бачылі ў жыцці на вёсцы. Таму іх творы набываюць выключную цікавасць і значэнне ў беларускай літаратуры. Вось, напрыклад, вялікае апавяданне Ул. Кандрацені «Каханне» («Полымя рэволюцыі» № 11 за 1937 год). «Не мудрствуя лукаво», тав. Кандраценя на прыкладзе адной сям'і паказвае, як праз старыя традыцыі, праз капіталістычную спадчыну прарастаюць новыя разуменні, новыя адчуванні, новыя узаемаадносіны паміж людзьмі і як гэтае новае перамагае, выцясняе старую спадчыну. Для гэтага паказу тав. Кандраценя выбраў удалую тэму.

Цяга да ўласнасці — найбольш жывучая радзімая пляма капіталізма. І вось тав. Кандраценя абірае сваёй тэмай выжыванне гэтага перажытку, яго знішчэнне, добра разумеючы, што на гэтай глебе магчымы найбольш вострыя канфлікты, найбольш цікавыя сітуацыі.

Носьбітам ідэі ўласнасці тав. Кандраценя абраў бацьку Марынкі — Арцёма. Ён не быў кулаком, не быў нават багатым — ён быў звычайным селянінам, якога нястача вучыла быць ашчадным, дамавітым. Усё жыццё толькі і думкі было, каб мець што з тавару на нагу, — кажа ён пра сябе. Таму ашчадна адносіцца ён і зараз да гаспадаркі, рамантуе старыя чаравікі, якія дачка раіць выкінуць на сметнік, носіць сінюю шапку, якую калісь купляў на сваё вяселле.

Для чытача не з'яўляецца нечаканым, што ён схаваў грошы, якія згубіў яго будучы зяць Алесь. Аднак, гэтым учынкам ён уступае ў супярэчанні не толькі з навакольным асяроддзем, але і з самім сабой, з тым новым, што вырасла ў яго душы за час калгаснага жыцця. Яму хочацца сказаць Алесю, што ён знайшоў яго грошы, хоць язык па старой прывычцы ўласніка ўжо сказаў наперад сваё «не — не знайшоў»; яму сорамна хлапчука, які здагнаў яго і аддаў забытую ім рэшту ў кааператыве; яму сорамна дачкі і свайго сябра канюха Саўкі.

Ён, нарэшце, не вытрымлівае барацьбы з навакольным асяроддзем, нават не барацьбы, а толькі атмасферы, варожай усяму подламу, уласніцкаму. І ён ідзе да схаваных грошай, каб аддаць іх Алесю.

Але грошай ужо няма: Саўка адчуўшы па паводзінах Арцёма, што грошы знайшоў ён, — адшукаў іх і аддаў Алесю. Людзі зразумелі перажыванні Арцёма, яго пакуты і перараджэнне, таму і маладая пара і Саўка беражліва адносяцца да яго. Саўка кажа:

«От што, чалавеча, табе і душу трэба падмаладзіць: на ёй многа сажы асела са старога коміна. Завесці цябе ў лазню, венікам гарачым...».

Арцём разумее, завошта. Ён удзячан Саўку за навуку. «На вяселлі я цябе на самым покуце пасаджу».

«А то хіба не варта?» — усміхаецца разам з Саўкам і чытач: ён прысутнічаў пры нараджанні новага чалавека, хоць яго і завуць дзедам Арцёмам.

Вобраз дзеда Арцёма выпісан дэталёва і ўдумліва. Тав. Кандраценя скарыстаў тут і апісанне вонкавага выгляду чалавека(сівы, як голуб; выцвілая сіняя шапка з чорным аколышкам), і яго паводзіны (напрыклад, крыкнуў шэптам: «грошы, столькі грошай»), і яго перажыванні.

Менш дэталёва, хоць і з дастатковай паўнатою, выпісан напарнік Арцёма па пастушастве — Саўка. Ён падаецца праз успаміны і праз вонкавае апісанне, часам праз развагі (пра курорт, напрыклад). Псіхалагічны рысунак гэтага героя зведзены да мінімума. Яшчэ менш распрацавана Марына, бо яна ўзята толькі ў адным разрэзе: у разрэзе кахання да Алеся. Спроба паказаць яе на полі ці ў клубе, як не арганічная для сюжэта, так і засталася па-за рамкамі апавядання.

Некалькі выручае Марыну цеплыня падачы яе вобраза: яна бяжыць на музыкі «дзе не бачылі людзі, дык і падбегам»; яна сарамліва, праз маці, паведамляе бацьку аб сваім каханні да Алеся; вельмі цёпла падаецца заключная сцэнка ў садзе з салодкім пахам спелых яблыкаў.

Алесь акрэслен досыць рэдкім пункцірам — апроч таго, што ён згубіў грошы, што ён нясмелы і што ён любіць Марыну, мы нічога больш не ведаем. А Кандраценя мог-бы зрабіць яго больш рэльефным, пра гэта сведчыць хоць-бы эпізадычны малюнак на гумне, дзе бацька Алеся акрэсліваецца амаль адзінай рэплікай — пра ўкрадзены паўкошык.

Наогул трэба сказаць, што Кандраценя валодае назіральнасцю і майстэрствам паказу дэталі. Прыгадаю хоць-бы такія зграбныя мясціны: «гарбатыя гумны», «на змроках моцна пахне рамонак», «сівы, як голуб, бацька», «коні не адрываючыся грызуць свежую росную траву», «жыта ўрадзіла, што сярпа не ўб'еш», «Арцём пазірае крытычна і зацікаўлена на дарогу, дзе відаць ніто куча гною, ніто нейкая чорная рэч» і г. д. і г. д. Вельмі станоўчым з'яўляецца тое, што Кандраценя ў гэтым майстэрстве карыстання мастацкай дэталлю вучыцца ў народа. «Сівы, як голуб», «сярпа не ўб'еш» — гэта народныя выразы.

Мастацкая дэталь, строгая прадуманасць сюжэта, што дае магчымасць паказаць асноўнага героя з некалькіх бакоў, раскрыць адну за другой рысы яго характару, — дапамаглі Кандраценю пазбегнуць схемы ў паказе новага чалавека і даць яго так, як ён ёсць, з яго станоўчымі якасцямі і з спадчынным рабацiннем. Прычым робіцца гэта не гвалтоўным прысцёгваннем адмоўных рыс станоўчаму тыпу, не выдумваннем такіх сітуацый, якія патрэбны толькі аўтару, а не чытачу, — робіцца гэта простым расказам пра зусім простыя жыццёвыя здарэнні, якія прышлося назіраць, якія прышлося асэнсаваць і зводзіць у адзіны сюжэтны малюнак. Некаторая знарачытасць адчуваецца толькі ва ўспамінах Саўкі, а рэшта малюнкаў арганічна звязана ў адно цэлае.

Ёсць у гэтай аповесці і недахопы, і гэта зусім натуральна: пры ўсёй яго здольнасці і таленце малады пісьменнік не можа зразу даць зусім беззаганны твор. Апрача вышэйпаказаных недахопаў у сэнсе няроўнай абмалёўкі асобных персанажаў аповесці, прычым пераважная большасць іх акрэслена слаба, — трэба адзначыць, як небяспечнае для пісьменніка з'явішча, пагоню за свежым словам. Яна часам збівае тав. Кандраценю на шлях бяссэнсавых сказаў, бяссэнсавых вобразаў. Напрыклад,— «плавае блакітны змрок», а поўстаронкай раней — «над зжатымі палеткамі плавае ў паветры вечаровая сінь», праз старонку — «у сенцах плавае дрымотны паўзмрок». Дрэнны сам па сабе вобраз ён «плавае» ў кароткай аповесці аж тры разы і рэжа вуха.

Дрэнна гучыць і такі выраз: «уздыхае бубен». Нічога падобнага да ўздыху ў грукаце бубна няма. Недакладна перададзен сэнс слова «гордуеш» — Кандраценя ўжывае слова «ганарыцца», якое мае зусім не той сэнс і выпірае з тэкста. Не ўдалася Кандраценю перадача «любоўнага варкавання» закаханай парачкі і ён вымушаны пускацца ва ўласныя развагі — не заўсёды трапныя. У прыватнасці, мары Алеся аб «любым-крыкунчыку» ідуць ад галавы, а не ад сэрца, і таму не пераконваюць.

Але ўсе гэтыя недахопы не зніжаюць добрага ўражання ад аповесці. Ад яе вее свежым поўнакроўным жыццём, вее маладосцю, чытач бачыць вясёлыя танцы дзяўчат, ён адчувае пах рамонка на зары, ён чуе спаданне спелых яблыкаў ноччу ў садзе, ён бачыць нараджэнне новых людзей у вёсцы, паказанае весела, спакойна, без крыклівых сентэнцый, і чытач рады — ён бачыць прыход у літаратуру маладой свежай сілы, маладога таленга.

Вітаем тав. Кандраценю з поспехам і жадаем далейшых удач.

М. КЛІМКОВІЧ.

Падрыхтоўка да выбараў у Вярхоўны Совет БССР

ПРАГРАМА РАДЫЕВЯШЧАННЯ

Беларускі радыёкамітэт вызначыў на час падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет БССР шырокую праграму радыёвяшчання.

Цэнтральнае месца ў гэтай праграме адведзена Сталінскай Канстытуцыі і яе тварцу—таварышу Сталіну, ролі камуністычнай партыі ў барацьбе з ворагамі народа—трацкісцка-бухарынскімі, нацыянал-фашысцкімі бандамі, ролі камуністычнай партыі ў будаўніцтве бяскласавага грамадства.

Працоўныя яшчэ раз пачуюць хвалюючае выступленне таварыша Сталіна на перадвыбарчым сходзе Сталінскай выбарчай акругі гор. Масквы 11 снежня 1937 года, запісанае на плёнцы. Будзе таксама перададзена запісаная на плёнку прамова таварыша Молатава на перадвыбарчым сходзе Молатаўскай выбарчай акругі. Рад перадач будзе прысвечан гістарычнай перамозе блока комуністаў і беспартыйных, першай Сесіі Совецкага парламента і яе пастановам, значэнню VIII сесіі ЦВК БССР 11 склікання, выбарчаму закону БССР і г. д.

Будзе перададзен рад артыкулаў і гутарак на тэмы: «Сталін—арганізатар Беларускай ССР», «Сталін—друг беларускага народа», «Што дала совецкая ўлада працоўным БССР», «БССР—верны фарпост на рубяжы з капіталістычным Захадам», «Выбары ў Совецкім Саюзе і ў фашысцкіх краінах», «Абарона бацькаўшчыны—свяшчэнны абавязак грамадзян СССР» і інш.

Для прапаганды Канстытуцыі БССР і выбарчага закона арганізуецца радыёкансультацыя. Радыёслухачы атрымаюць па радыё адказы на пытанні, звязаныя з Канстытуцыяй і выбарчым законам.

У праграму радыёвяшчання ўключан цыкл перадач аб выдатных людзях нашай рэспублікі, аб дэпутатах Вярхоўнага Совета СССР, кандыдатах у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, аб стаханаўцах прамысловасці і сельскай гаспадаркі, пагранічніках, камандзірах і байцах Чырвонай Арміі, працоўнай інтэлігенцыі і інш.

Перад мікрафонам выступяць агітатары, бяседчыкі, давераныя—з паказам вопыту іх агітацыйнай і прапагандысцкай работы на выбарчых участках.

Цікавыя перадачы вызначаны літаратурна-драматычным аддзелам Радыёкамітэта. Да іх адносяцца літаратурна-музычныя перадачы «Шчаслівае сузор'е адзінаццаці брацкіх рэспублік», «Дзякуй таварышу Сталіну за шчаслівае жыццё», «Ленін і Сталін у беларускай народнай творчасці», «Сталінская Канстытуцыя ў беларускай народнай творчасці», літаратурна-музычныя перадачы на тэмы паасобных артыкулаў Сталінскай Канстытуцыі і г. д. У гэтых перадачах прымуць удзел пісьменнікі, паэты, артысты, удзельнікі рабочай, калгаснай, чырвонаармейскай, студэнцкай мастацкай самадзейнасці.

Надзвычай багатая праграма музыкальных перадач. Яна прадугледжвае каля 80 канцэртаў мэтавага значэння і каля 35 канцэртаў—справаздач лепшых выканаўцаў.

Рад прапагандысцкіх, літаратурных і музычных перадач, прысвечаных выбарам у Вярхоўны Совет БССР, арганізуюцца спецыяльна для дзяцей.

Адначасова праводзіцца рад арганізацыйных мерапрыемстваў па лепшаму абслугоўванню радыёслухачоў. Арганізуецца масавая праверка радыёўстановак і рамонт іх. Для гэтай-жа мэты ў радзе раёнаў створаны брыгады радыёаматараў. У 15 раёнах ствараюцца радыёперасоўкі. Час работы радыёвузлоў павялічваецца з 7 гадзін у суткі да 10 з паловай гадзін. Прыняты меры для пашырэння сеткі радыёкропак.

Праграма вызначана. Задача Радыёкамітэта і ўсяго яго калектыва дабіцца поўнага і высокаякаснага яе выканання.

П.

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ДРАМТЭАТРА БССР

Калектыў работнікаў Дзяржаўнага Драматычнага тэатра БССР прыняў абавязацельствы па актыўнаму ўдзелу ў падрыхтоўцы да выбараў і ўдзелу ў выбарах у Вярхоўны Совет БССР.


У Белдзяржрдрамтэатры арганізуюцца шэсць гурткоў па вывучэнню Канстытуцыі БССР і «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», якія ахапляюць усіх работнікаў тэатра.

У хуткім часе, перад кожным спектаклем тэатр будзе паказваць гледачам спецыяльна падрыхтаваную інтэрмедыю, прысвечаную выбарам.

Арганізуюцца выезды канцэртных брыгад на выбарчыя ўчасткі і на кватэры лепшых стаханаўцаў. Вылучана група актораў для дапамогі самадзейным гурткам у падрыхтоўцы да выбараў. Падарожжа тэатра ў раёны БССР будзе выкарыстана для абслугоўвання выбарчай кампаніі.

У часе гастрольнага падарожжа па Украінскай ССР тэатр абслужыць выбаршчыкаў братняй рэспублікі.

26 чэрвеня 1938 года калектыў тэатра выканае свой пачэсны абавязак—аддасць свае галасы за лепшых людзей нашай радзімы, да канца адданых партыі Леніна—Сталіна.



Вясна ў Узбекістане. Каля квітнеючай яблыні.

Фото Дарэнскага (СФ).

„ЦІХІ ДОН“

Прэм'ера Дзяржаўнага Беларускага тэатра оперы і балета.

Опера «Ціхі Дон» маладога кампазітара І. Дзяржынскага — першы вялікі, таленавіты і яркі, сапраўды совецкі оперны твор, які паказвае дарогу для далейшага развіцця совецкай оперы. Дзяржынскі на матэрыяле рамана М. Шолахава змог з вялікай глыбінёй перадаць шлях працоўнага данскога казацтва да напага сёння і на гэтым фоне разгарнуць асабістую драму сваіх герояў. Зрабіў гэта ён проста, пераканальна, з вялікай мастацкай сілай. «Ціхі Дон» стаў папулярным, любімым спектаклем працоўных. Галоўнае ў тым, што опера выключна эмацыянальная, яна хвалюе, актывізуе, запаляе.

Але гэтага галоўнага—эмацыянальнасці, пераканальнасці, тэмпераменту пастаноўка Дзяржаўнага Беларускага тэатра оперы і балета якраз і не перадала.

Пастаноўшчык, выходзячы з зусім правільнай устаноўкі паказаць асноўны і вядучы кампанент опернага спектакля — спевака, не змог спалучыць у ім і актора. Людзі ў спектаклі нібы жывуць, але, як толькі наступае момант спявання, гэта жыццё траціцца, застаецца перад гледачом толькі чалавек, які спявае. І гэта не толькі ў салістаў, але і ў масавых сцэнах, прычым у апошніх дынаміка дзеяння падмяняецца нейкай мітуснёй, што стварае ўражанне разгубленасці.

Безумоўна, пастаноўшчыку вельмі перашкаджалі невялікія памеры сцэны, гэта зразумела, але нават і з гэтай скідкай рэзультаты мала пераканальныя. У спектаклі няма адзінства, няма агульнай лініі і мэтанакіраванасці. Добра зроблены толькі асобныя моманты. Найбольш удалай па выразнасці аказалася 4-я карціна — у доме Лістніцкага, а таксама асобныя эпізоды 5-й карціны—на аўстрыйскім фронце. Вельмі добрае ўражанне пакідаюць дэкарацыі (мастак Н. А. Каровін), зробленыя ярка і маляўніча, цікава і з вялікім мастацкім густам. Асабліва хочацца адзначыць поўны жыцця квітучы сад (2-я карціна) і вынаходлівую, жывапісную карціну вясенняга ўскрыцця ракі (6-я карціна).

Калектыў тэатра, працуючы над операй, правёў значную работу. Рад ролей у агульным зроблены ўдала. У першую чаргу гэта датычыць партыі Аксінні ў выкананні засл. арт. рэсп. Л. П. Александроўскай і артысткі Т. Н. Берэзінец. Л. П. Александроўская заўсёды падкупляе сваімі вакальнымі данымі, прадуманасцю і выразнасцю сцэнічнага ўвасаблення. Маладая артыстка Т. Н. Берэзінец валодае гучным, прыемнага тэмбру, голасам. Яе сцэнічныя здольнасці, эмацыянальнасць перадачы робяць партыю Аксінні яркай і запамінаючайся. Вельмі жвавым і выразным зрабіў вобраз Мішука артыст П. І. Засецкі. Прыкметны, характэрны тып стварыў з невялікай эпізадычнай ролі І. М. Балопін. Пераканальныя і даходлівыя вобразы Сашкі і Яўгенія Лістніцкага ў перадачы артыстаў І. А. Мурамцава (Сашка) і А. Д. Арсенка (Яўгеній). Арсенка, новы артыст тэатра, паказаў сябе з самага добрага боку — і па сваіх галасавых сродках і як актор. Прыемнае ўражанне, як здольная вакалістка, пакідае Р. В. Млодэк (Наталья). Добра гучыць і перадае музыкальны змест оперы аркестр пад кіраваннем маладога, здольнага дырыжора А. В. Ратнера. Культурна, музыкальна, стройна, з добрым мастацкім густам і тактам зроблены хормейстрам А. С. Сцяпанавым хоры.

На жаль, гэтыя станоўчыя бакі спектакля не выратоўваюць усёй пастаноўкі. Агульны характар бледнасці, статыкі, недастатковай прадуманасці, раскіданасці адчуваецца ўсюды. Вядучая партыя Грыгорыя даручана артысту Л. Ф. Штрыкуль. Хадульная, ненатуральная, напружаная манера трымацца на сцэне, зусім недастатковыя для выканання гэтай партыі галасавыя магчымасці артыста зрабілі тое, што гэта галоўная роля амаль выпадае з спектакля.

Артыст В. Д. Магарскі (Панцялей Мелехаў) зусім забывае аб тым, што ён оперны спявак. Рад ролей зусім слабыя і невыразныя (напрыклад, генерал Лістніцкі).

Заўважаецца, што работа над вобразамі дзеючых асоб не даведзена да канца, што акторы ўспрымалі розныя рэжысёрскія ўстаноўкі, атрымалася ласкутнасць, разарванасць. Гэта прыкметна нават у выкананні такой здольнай і чулай актрысы, як Александроўская, якая амаль у кожнай карціне трымаецца па-рознаму.

Дарэчы, трэба проста сказаць, што драматычная насычанасць, сіла, страснасць вобраза Аксінні губляецца, калі партыю выконвае сапрана, якое імкнецца да лірычнага плана і па характару свайго голаса не можа даць таго, што патрабуецца аўтарам. Кампазітар пісаў гэту партыю для меццо-сапрана. І таму партыя Аксінні ў выкананні артысткі Берэзінец утварае больш сакавітае і яркае ўражанне.

Бледны ў сцэнічных адносінах вобраз Натальі.

Мізансцэны таксама пакідаюць жадаць шмат лепшага. Узяць хоць-бы апавядаючага Сашку (4-я карціна), якому не прыдумалі нічога, акрамя бязмэтнага бегання па лесвіцы. Хоры, калі яны выступаюць як дзеючыя асобы, застываюць.

Не знайшоў адзінай мэтанакіраванай лініі і дырыжор, які занадта захапляецца ў месцах уздыму і застывае ў напеўных, лірычных, але не менш глыбокіх, момантах музыкальнай фактуры оперы.

Толькі спешкай, недастатковай прадуманасцю можна вытлумачыць той факт, што пры наяўнасці ў тэатры маладога, даравітага і працаздольнага калектыва, які сумуе па сапраўднай, моцнай справе, прэм'ера «Ціхі Дон» не дала таго рэзультату, які мог і павінен быў быць. Кіраўніцтву тэатра трэба вельмі і вельмі падумаць над гэтым, заняцца сур'ёзнай работай. Тэатр оперы і балета павінен ствараць спектаклі, сапраўды вартыя нашай вялікай эпохі.

Н. ШЧЭГЛОЎ.

НАБОР У ТЭАТРАЛЬНАЕ ВУЧЫЛІШЧА

У гэтым годзе ў Менску пачынае работу тэатральнае рэспубліканскае вучылішча, якое будзе падрыхтоўваць маладыя акторскія кадры для беларускіх тэатраў. Тэрмін навучання чатыры годы. Студэнты забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй.

У вучылішча прымаюцца асобы ва ўзросце ад 17 да 30 год, якія маюць адукацыю не ніжэй няпоўнай сярэдняй школы альбо сямі класаў поўнай сярэдняй школы.

Да падаваемых заяў павінны быць далучаны: пасведчанне аб нараджэнні альбо метрычнае пасведчанне, пасведчанне аб адукацыі, даведка аб становішчы здароўя і прывіцці воспы, дзве фотакарткі з уласным подпісам і даведка аб адносінах да вайсковай службы,—усё ў арыгіналах. За ўсімі даведкамі трэба звяртацца ў Упраўленне па справах мастацтваў (Дом урада, пакой № 602).

С. Гарадзецкі

ЛАНДЫШ

Пра што шумяць кусты ў цяні?
Пра бездань сіняй вышыні?
Пра змрок, што ногі ім спавіў,
Дзе ландыш квола стан схіліў?

Яго ўжо зморвае жара,
І паміраць яму пара.
А лета толькі надышло,
Вакол рассеяўшы цяпло.

Лагодны, гожы і адзін,
Увяўшы сумна між раслін,
Апошні раз ён празвініць,
Апошні раз ён ап'яніць.
Вячэрні подых, і зямля
Глыне крышталь з яго лісця
У грудзі прагныя свае,
Песняр-жа песню ёй спяе.
Яна дала, яна ўзяла,
Яна звіла ў адзін вянок
І слодыч першага цяпла
І смерці горыч-халадок.

Пераклаў **ЯКУБ КОЛАС.**

„ВОЛГА—ВОЛГА“

(Музыкальная камедыя вытворчасці Мосфільм)

Глядач з нецярплівасцю чакае паяўлення на экране кожнай новай камедыі заслужанага дзеяча мастацтваў рэжысёра Александрава. Народ палюбіў «Вясёлых рэбят», «Цырк» і, бясспрэчна, палюбіць яго новую музыкальную камедыю «Волга—Волга».

Гэта карціна па-праву называецца музыкальнай камедыяй. Музыка ў ёй перарасла ілюстрацыйную функцыю, якую яна мае ў звычайных гукавых карцінах, і стала арганічнай сюжэтнай лініяй фільма. Сюжэт гэтай карціны немыслімы без музыкі і песні, бо гэтага патрабуе тэма, якая раскрывае росквіт народнай мастацкай творчасці.

Ці азначае гэта, што тэма народнай творчасці здробнена ці зніжана камедыйнымі прыёмамі яе вырашэння? Зусім не. У межах свайго жанра яна расквітнела яркімі блесткамі рэжысёрскай і акторскай выдумкі. Трэба сказаць, што майстэрства выдумкі ў карціне здзіўляе сваёй шматвобразнасцю і арыгінальнасцю. Арыгінальны ў сэнсе камедыйнай сітуацыі сюжэтны замысел з бюракратам Бывалавым. Кіраўнік «дробнай мясцовай прамысловасці» Бывалаў атрымлівае з Масквы тэлеграму, у якой яму прапаноўваюць арганізаваць мастацкую самадзейнасць у сваёй сістэме і лепшыя мастацкія калектывы прывезці ў Маскву для ўдзелу ва Усесаюзнай алімпіядзе мастацкай самадзейнасці. Вузкалобы бюракрат Бывалаў усё мог дапускаць, але толькі не тое, што ў далёкім маленькім Мелкаводску ёсць таленты.

Пісьманосец Дуня — лепшы ініцыятар мастацкай самадзейнасці Мелкаводска, вырашыла давесці Бывалаву адваротнае. І вось, супроць Бывалава пачалася музыкальна-вакальная атака. Куды-б ні ткнуўся Бывалаў — усюды яго сустракаюць песня, музыка, танцы, арганізаваныя Дуняй. Бывалаў абяссі... лены ад нечакана нахлынуўшага на яго патока творчых талентаў маленькага Мелкаводска. Гэта, можна сказаць, са... мая лепшая частка карціны, дзе з... арыгінальным камедыйным прыёме па... казан сапраўдны парад народных да... раванняў.

Нельга яшчэ сказаць, што Алексан... драў дасканала ўжо вырашае сваю тэ... му. Да фільма «Волга—Волга» можн... прад'явіць больш вялікія патрабаванні. Месцамі ў карціне падкрэслена нейка... супроцьстаўленне класічнай музы... народным мелодыям. А гэта ўжо фаль... шыва і няверна. У сярэдзіне карціны рэжысёр губляе адчуванне меры і рас... цягвае карціну за кошт самадзейны... эксцэнтрычных атракцыёнаў.

Засл. арт. Орлова (Дуня) і арт. Іга... Ільінскі (Бывалаў) ствараюць у карці... не два незабыўных камедыйных вобра... зы. Ільінскі на гэты раз адмовіўся а... штучнага вонкавага штампа і імкнуў... ся раскрыць вобраз Бывалава больш... унутрана, сродкамі свайго тонкага к... медыйнага даравання. Арт. Орлова яшчэ раз давяла, што яна з аднолька... вым майстэрствам можа ствараць лі... рычны вобраз Мэры Дыксон і эксцэнт... рыка-камедыйны вобраз Анюты ... пісьманосца Дуні. І тое і другое, вядо... ма, не вычэрпвае ўсіх яе магчымасцей. Паміж іншым, «Волга—Волга» — б... дай адзіная карціна, дзе аб актора... нельга гаварыць у адрыве ад музы... і кампазітара. Засл. дзеяч маст. ор... наносец Дунаеўскі побач з рэжысёра... прарабіў велізарную работу па ства... рэнню музыкальных вобразаў фільма па стварэнню маляўнічых музыкаль... ных мелодый, якія гучаць у карціне я... лёгкае, радаснае дыханне.

З такім дыханнем глядач глядзіць і слухае карціну.

К. ГУБАРЭВІЧ.



Кадр з фільма «Волга—Волга». Арт. А. Тутышкін у ролі Алёшы Трубышкіна, засл. арт. Л. Орлова ў ролі Дуні Пятровай.

І. І. Стэбун

МІХАЙЛА КАЦЮБІНСКІ

25 красавіка 1938 года споўнілася 25 год з дня смерці выдатнага класіка украінскай літаратуры, народнага пісьменніка-дэмакрата Міхаіла Міхайлавіча Кацюбінскага.

А. М. Горкі, адзін з бліжэйшых прыяцеляў М. Кацюбінскага, у артыкуле, прысвечаным памяці апошняга, пісаў:

«У свеце ідэй хараства і дабра—ён «свой» чалавек, родны чалавек, і з першай сустрэчы ён абуджае жаданне бачыць яго як мага часцей, гаворыць з ім больш.

Ён, які аб усім падумаў, неяк асабліва блізкі добраму і ў ім кіпіць арганічная гідлівасць да паганага. У яго тонка развіта эстэтычная чуткасць да добрага, ён любіць дабро любоўю мастака, верыць у яго пераможную сілу, і ў ім жыве пачуццё грамадзяніна, якому глыбока і ўсебакова зразумела культурнае значэнне, гістарычная каштоўнасць дабра.

Ён вельмі часта гаварыў аб дэмакратыі, аб народзе і заўсёды гэта было неяк асабліва прыемна слухаць, прыемна і павучальна».

У гэтых радках праўдзіва і трапна вызначаны істотныя рысы Кацюбінскага—чалавека і пісьменніка.

Кацюбінскі быў глыбока чалавечным; два вялікіх свяшчэнных, сапраўдны чалавечых пачуцці жылі ў ім, пранізваючы ўсю яго творчасць; любоў і нянавісць,—ён страсна любіў чалавецтва, народ, верыў у яго сілу і неадольнасць, ва ўрачыстасць народных ідэалаў, і з няменшай страснасцю ён ненавідзеў ворагаў чалавецтва і прагрэсу. Яму нянавісны былі царызм, памешчыцка-капіталістычная сістэма, усё тое, што прыгнятала, што душыла чалавечае ў чалавеку, ператварала яго ў раба. Любоў і нянавісць пісьменніка знайшлі ў яго творах сваё творчае праяўленне: глыбокі лірызм і едкая сатыра сталі арганічнымі элементамі творчасці Кацюбінскага. Лірычнай цеплынёй вее ад паказаных ім народных герояў у «Фата Маргана» і ў той-жа час у знішчальна-сатырычным плане паказан ім супроцьлеглы лагер—ворагі чалавецтва: цары, папы, нацыяналісты, буржуазныя лібералы («Ён ідзе», «Персона графа», «Смех», «Хо», «Коні не вінаваты» і інш.).

Кацюбінскі—пісьменнік-дэмакрат і гуманіст, быў разам з тым буйнейшым майстрам мастацкага слова. Спалучаючы ў сябе гэтыя якасці, узбагачаючыся лепшымі дасягненнямі сусветнай літаратуры і мастацтва, Кацюбінскі змог стварыць класічныя вобразы высокамастацкай рэалістычнай літаратуры. Яго аповесць—эпапея «Фата Маргана», якая адлюстроўвае жыццё і барацьбу украінскай вёскі ў перыяд першай рускай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1905 года, заслужана лічыцца класічнай памяткай сусветнай літаратуры. Пераклікаючыся ў тэматыцы з выдатнай аповесцю М. Горкага «Маці»—«Фата Маргана» Кацюбінскага ўвекавечыла сваімі вобразамі гістарычныя старонкі жыцця і барацьбы украінскага народа. Тут адлюстраваны карціны цяжкага беспрасветнага жыцця сялянскіх мас ва ўмовах дарэвалюцыйнай царска-прыгонніцкай сістэмы. І не выпадкова Л. М. Кагановіч у сваім выступленні на X з'ездзе КП(б)У, гаворачы аб жыцці украінскага сялянства ў дарэвалюцыйныя годы, ілюстраваў свае словы ўрыўкамі з «Фата Маргана» Кацюбінскага.

У сваіх рэвалюцыйных навелах Кацюбінскі бязлітасна выкрываў царызм і яго верных прыслужнікаў—царкву і буржуазных лібералаў, зрываючы з іх маскі і выкрываючы іх антынародную, рэакцыйную сутнасць.

Праследуемы жандармерыяй і цэнзурай, гадзючым сіпеннем украінскіх нацыяналістаў, якія ненавідзелі пісьменніка-дэмакрата, Кацюбінскі ні на хвіліну не кідаў пяра, заставаўся да канца сваіх дзён верным і адданым сынам народа.

Жывучы ў вёсцы, сутыкаючыся непасрэдна з сялянскім жыццём, ён бачыў, ды і сам выпрабаваў, увесь цяжар сялянскага быцця — галоднае гібенне, цемру, цяжкую працу пад ярмом памешчыка. Ён слухаў украінскія народныя песні, у якіх выліваліся боль і пакуты працоўных, і яны былі блізкі яго сэрцу; ён пачаў сам пісаць вершы на фальклорны ўзор. Так былі зроблены першыя творчыя крокі.

Дэмакратычная накіраванасць творчасці пісьменніка прыцягнула да яго асаблівую ўвагу паліцыі; творы пісьменніка ў большасці сваёй не дапускаліся цэнзурай да распаўсюджвання на Украіне, як «шкодныя рэвалюцыйныя, якія могуць выклікаць супрацьўленне ўладзе». Аднак, праз цэнзурныя рагаткі імя пісьменніка становіцца папулярным на Украіне. Вядомы украінскі класік-пісьменнік і літаратурны крытык 80-90 год Іван Франко высока ацэньвае творчасць Кацюбінскага, ставячы яго «на першым плане сярод празаікаў 90-х год».

У 1897 годзе Кацюбінскі робіць спробу пасяліцца ў Чарнігаве, але губернатар не дае на гэта сваёй згоды, ведаючы аб ім, як аб «чалавеку шкоднага накіравання», «вельмі неблаганадзейным», «рэвалюцыйна-настроеным». І Кацюбінскі прымушан быў выехаць у Жытомір загадваць канторай мясцовай газеты «Валынь». На старонках правінцыяльнай газеты Кацюбінскі вядзе аддзел — «Святло і цені рускага жыцця». У сваіх вострых публіцыстычных артыкулах, наколькі дазвалялі толькі ўмовы цэнзуры, ён выкрывае агідную палітыку царызма, эксплаатацыю капіталістамі працоўных, прыгнечанне нацыянальных меншасцей — калмыкаў, якутаў і інш.

У 1898 годзе Кацюбінскаму ў канцы-канцоў удаецца пасяліцца ў Чэрнігаве (дзе жыла яго сям'я) і заняць пасаду статыстыка ў статыстычным бюро Чэрнігаўскага губернскага земства. Цяжкая, знясільваючая штодзённая работа статыстыка займала ўвесь час пісьменніка, адбівалася на яго слабым здароўі, у той-жа час матэрыяльна не забяспечвала яго; ён прымушан быў яшчэ браць дадатковыя работы з боку. Усё гэта падрывала здароўе.

Трагізм гэтага становішча ўзмацняўся яшчэ тым, што гэтыя годы — апошняе дзесяцігоддзе яго жыцця — былі часам творчага росквіту пісьменніка.

На рэвалюцыйныя падзеі 1905 года Кацюбінскі, як сапраўдны пісьменнік-дэмакрат, адгукаецца радам выдатных твораў, у якіх адкрыта вітае рэвалюцыю («Фата Маргана») і ў той-жа час накіроўвае вастрыё свайго пяра супроць апосталаў чорнай рэакцыі («Ён ідзе», «Смех», «Інтэрмецца», «Персона графа» і інш). У супроцьлегласць украінскай буржуазна-нацыяналістычнай літаратуры, якая капітулявала перад царызмам і стала трубадурам рэакцыі, Кацюбінскі смела ўзняў голас рэвалюцыйнага пратэсту, раўняючыся на перадавую рэвалюцыйную літаратуру таго часу. Следам за Горкім Кацюбінскі падымае злабадзённую тэму рэвалюцыі — выкрыццё здрадніцкай контррэвалюцыйнай ролі лібералізма («Смех», «У дарозе», «Коні не вінаваты»).

Збліжэнне Кацюбінскага з Горкім было невыпадковым. Адчуваючы сябе адзінокім ў асяроддзі украінскіх буржуазна-нацыяналістычных літаратараў, чужы ім Кацюбінскі бачыў у Горкім блізкага яго імкненням пісьменніка-рэвалюцыянера. У пачатку лета 1909 года Кацюбінскі едзе на Капры да Горкага.

А. М. Горкі, які высока ацэньваў Кацюбінскага, быў ініцыятарам выдання твораў украінскага пісьменніка на рускай мове. Па яго прапанове выдавецкае таварыства «Знание» выдала два томы выбраных твораў Кацюбінскага. Пасля выхаду першага тома з друку Горкі захоплена пісаў Кацюбінскаму.

«Кніжку вашу прачытаў з вялікай асалодай і душэўнай радасцю».

Такая ацэнка вялікага пісьменніка падбадзёрвала і натхняла Кацюбінскага. «Калі вам падабаецца — значыць, варта пісаць» — адказаў ён Горкаму.

Як і Горкі, Кацюбінскі групіруе вакол сябе таленавітую творчую моладзь, накіроўваючы яе на шлях сапраўды дэмакратычнай, народнай літаратуры. Сярод гэтай моладзі Кацюбінскі звярнуў асаблівую ўвагу на Паўла Тычыну (буйнейшага цяпер паэта Совецкай Украіны), ужо тады адчуўшы ў ім незвычайнага паэта.

Аднак, гэта былі ўжо апошнія годы жыцця украінскага класіка. Падарваны цяжкімі ўмовамі жыцця, непасільнай працай арганізм пісьменніка не вытрымаў. 25 красавіка 1913 года Кацюбінскі памёр.

Непрыкрытым цынізмам сустрэлі смерць Кацюбінскага украінскія нацыяналісты і чорнасоценцы, імкнучыся ачарніць імя вялікага народнага песняра, аддаць яго забыццю. Аднак, гэта было не ў іх сілах. Працоўныя Украіны высока ацанілі і праславілі імя свайго пісьменніка. І, як-бы ў адказ нацыяналістычнай зграі, прарочна прагучалі тады-ж цудоўныя словы Аляксея Максімавіча Горкага, як голас усяго народа, голас дэмакратыі:

«Вялікага чалавека страціла Украіна, доўга і хораша будзе памятаць яна яго добрую работу».

Рэалізм Кацюбінскага — рэалізм вялікіх мастацкіх абагульненняў. У сваёй творчасці пісьменнік адлюстраваў істотныя рысы сучаснай яму рэчаіснасці — і ў гэтым вялікая пазнавальная каштоўнасць творчасці Кацюбінскага.

Пазнавальная сіла яго твораў абумоўлена яшчэ і тым, што сацыяльная рэчаіснасць была першакрыніцай яго творчасці. Як вялікі мастак-рэаліст, Кацюбінскі вывучаў, даследваў аб'ектыўную рэчаіснасць. Дастаткова напомніць вялікую работу пісьменніка, праробленую ім над матэрыяламі д... «Фата Маргана»; уважлівае вывучэнн... «жыццёвых» дакументаў — судовы... спраў аб аграрным сялянскім руху н... Чэрнігаўшчыне; бязмежную колькасц... тэматычных распрацовак, нататак, н... глядання, сабраных пісьменнікам д... сваіх твораў з жыцця бесарабскіх ма... давая, крымскіх татар; вялікую коль... касць этнаграфічных і гістарычны... матэрыялаў, сабраных пісьменніка... Запісная кніжка была нязменным сп... дарожнікам пісьменніка. Аднак, **ра... лізм Кацюбінскага далёкі ад эмпіры... ма.** Кацюбінскі ўмеў з бязмежнай коль... касці нагляданняў выбраць самыя ты... повыя, самыя істотныя.

Сваёй творчасцю Кацюбінскі адкры... новую старонку ў гісторыі украінска... прозы, узняўшы літаратурнае слова н... вышэйшы мастацкі ўзровень. Кацюбін... скі адлюстраваў думкі і настроі шыро... кіх працоўных мас, іх рэвалюцыйны... імкненні. Рэвалюцыя 1905 года, ча... першых масавых рэвалюцыйных ба... пралетарыята і рэвалюцыйнага сяля... ства супроць самадзяржаўна-капіталі... стычнага ладу і, нарэшце, перы... рэакцыі з'яўляюцца тымі сацыяльна... палітычнымі абставінамі, з якімі неп... рыўна звязана не толькі па часе, ал... і па сваёй праблематыцы творчасць вялікага пісьменніка-дэмакрата.

І калі украінская нацыяналістычн... буржуазная літаратура выступала я... трубадур контррэвалюцыі і пела дыф... рамбы украінскаму памешчыку, капіта... лісту і кулаку, якія ішлі адзіным фрон... там чорнай рэакцыі супроць рабочых і сялян, дык голас Кацюбінскага, песня... ра сялянскай рэвалюцыйнай дэмакра... тыі быў з тымі, хто смела ўзняў чыр... воны сцяг барацьбы за вызвален... з-пад гнёту і эксплаатацыі.

Рэвалюцыйная барацьба была адны... з лейтматываў творчасці Кацюбінскага і ў гэтай барацьбе за шчаслівае буду... чае чалавецтва пісьменнік аддаў ус... вялікую сілу свайго талента.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.